ЛЕТНІЯ ХВАРОБЫ: АТРУЧВАННІ І АЛЕРГІІ 7

ДОЎГАЕ РЭХА ВАЙНЫ... 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

22 МАЯ 2019 г. СЕРАДА

№ 93 (28960)

ЗВЯЗДА

НАФТА, ЭКСПАРТ І ВУП

Учора Прэзідэнт сабраў нараду па актуальных пытаннях эканомікі

«Традыцыйна па ініцыятыве ўрада мы сёння абмяркуем блок эканамічных пытанняў — бягучых і, калі трэба, на перспектыву. Хацелася б пачуць ад прэм'ер-міністра і віцэ-прэм'ераў, якая сітуацыя ў нас з экспартам. Натуральна, найважнейшае пытанне — валавы ўнутраны прадукт: які ў нас рух у гэтым кірунку?» — спытаў Прэзідэнт.

Фота БелТА.

Беларускі лідар дадаў, што афіцыйную статыстыку па ВУП ведае, таму ён пацікавіўся ў прысутных, на якія паказчыкі ў выніку такой дынамікі наша краіна выйдзе на канец года.

«Але экспарт мяне хвалюе больш за ўсё, таму што гэта валюта, без якой нам вельмі складана існаваць, ды і эканоміцы развівацца таксама», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы заклікаў агучыць праблемы ў гандлёва-эканамічных адносінах з Расіяй, а таксама пытанні ў супрацоўніцтве з Еўрапейскім саюзам.

«Два асноўныя нашы партнёры, нават Еўрапейскі саюз па экспарце зараз апяроджвае Расійскую Федэрацыю», — заўважыў ён і нагадаў формулу па дыверсіфікацыі экспарту: 30 % на Расію, 30 % — на Еўропу, 30 % — на краіны Далёкай дугі. У такім выпадку, паводле слоў беларускага лідара, экспарт можна лічыць дыверсіфікаваным.

«Ну і бягучыя пытанні: нашумелая праблема атрутнай нафты — якая цяпер сітуацыя ў нас у гэтым плане? Я прачытаў даклад і вярнуў яго прэм'ер-міністру. Вы мне больш не пішыце гэтыя даклады, вы проста губляеце час. Мне гэтыя опусы ні да чога. Трэба два радкі: чаго вы дамагліся станоўчага за апошні час. Навошта вы мне апісваеце ўвесь свой гераізм, з кім вы там сустракаліся, з кім размаўлялі, што абмяркоўвалі, як абмяркоўвалі, — мне патрэбен вынік», — запатрабаваў Прэзідэнт.

Яшчэ адно пытанне нарады — пастаўкі сельскагаспадарчай прадукцыі на расійскі рынак.

«Паводле маёй інфармацыі, сёння каля 60 беларускіх прадпрыемстваў поўнасцю або часткова закрытыя ў сувязі з пастаўкамі на расійскі рынак», — паведаміў кіраўнік дзяржавы. Больш за тое, сёння сітуацыя такая, што Беларусь не выконвае ўжо падпісаныя гандлёвыя балансы па сельгаспрадукцыі, таму што Расія не выконвае свае абавязацельствы. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, чаму ў сувязі з гэтым не прымаюцца меры.

Пра канчатковы разлік шкоды ад бруднай нафты

Яшчэ адзін месяц неабходны для канчатковага разліку шкоды ад бруднай нафты.

Па выніках нарады прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас дэталёва расказаў журналістам пра кожнае з паднятых пытанняў.

Ён адзначыў, што брудная нафта — адна з тэм, якую прэм'ер-міністр плануе абмеркаваць на пятнічнай сустрэчы з расійскім калегам Дзмітрыем Мядзведзевым.

Сяргей Румас нагадаў пра створаную рабочую групу па дадзенай праблеме і паведаміў наступнае: «Практычна ўзгоднена дарожная карта з Расійскай Федэрацыяй. Некаторыя яе пункты ўжо выконваюцца абодвума бакамі, нягледзячы на тое, што яна яшчэ не фармалізаваная». У гэтай дарожнай карце сфармуляваны ўвесь пералік мер, які дазволіць вырашыць пытанне адпампоўкі бруднай нафты для аднаўлення транзіту ў бок Заходняй Еўропы.

СТАР. 2

АДРАДЖЭННЕ ЧАРЭЙСКАЙ КРАСЫ

Роўна месяц таму ў вёсцы Чарэя Чашніцкага раёна прайшла культурна-экалагічная акцыя па адраджэнні былой красы сядзібы рода Мілашаў, з якога паходзіў французскі паэт Оскар Мілаш, — тут пасадзілі калекцыю саджанцаў бэзу. Вяскоўцы, арганізатары фестывалю «Справа» (фестываль праходзіць кожны год на Чарэйскім возеры) і віцебскія валанцёры пасадзілі сарты бэзу сучаснай селекцыі, а таксама парасткі бэзу, які цудам захаваўся з часоў маленства паэта, а менавіта з апошняй чвэрці XIX стагоддзя. Сярод удзельнікаў акцыі была і бібліятэкар Чарэйскай бібліятэкі, апантаны краязнаўца Таццяна КАЗЛОЎСКАЯ *(на фота)*. Яна кожны дзень прыходзіць на новую алею і палівае саджанцы. Дзякуючы Таццяне Міхайлаўне ўсе 38 дрэўцаў дружна прыжыліся, а некаторыя з іх, як, напрыклад, сорт Сенсацыя, нават закрасавалі.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ІСАЧАНКА, старшыня Мінскага аблвыканкама:

«Прыёмы грамадзян застануцца, але падыход да вырашэння пытанняў крыху зменіцца. Мы будзем старацца папярэдзіць звароты людзей і вырашаць пытанні на месцах. Гэта значыць старшыні выканкамаў і іншыя службовыя асобы не будуць чакаць, пакуль людзі прыедуць, напрыклад, у сельскі Савет, а самі выедуць на месцы. Яны пагутараць з людзьмі, раскажуць, што можна вырашыць, што ў найбліжэйшых планах, што будзе перанесена на наступны год. На мой погляд, такі падыход дасць большы эфект: гэта будуць прамыя зносіны з людзьмі, такім чынам будуць адразу вырашацца не толькі асабістыя праблемы, але і пытанні, якія маюць грамадскі рэзананс».

Чвэрць стагоддзя 25

Чарговая публікацыя нашай рубрыкі, прысвечанай ажыццяўленню дакументаў, падпісаных кіраўніком дзяржавы, — аб рэалізацыі Дырэктывы № 5 «Аб развіцці двухбаковых адносін Рэспублікі Беларусь з Кітайскай Народнай Рэспублікай».

ЖЫЛЛЁ, ЭНЕРГЕТЫКА І БЛІЗКАЕ ЗНАЁМСТВА

Фота БелТА.

Ключы віцебскія навасёлы атрымлівалі з рук пасла КНР у Беларусі Цуй ЦЫМІНА.

Супрацоўніцтва з Кітаем у Віцебскай вобласці рознавектарнае і не збаўляе абароты. Наадварот, яно пашыраецца ў розных сферах: ад будаўніцтва да культуры. У паўночным рэгіёне Беларусі дзякуючы супрацоўніцтву з КНР у прадстаўнікоў СМІ часта знаходзіліся інфармацыйныя нагоды. Словы «ўпершыню» або «ўнікальны» ў эфіры, сайтах або друкаваных артыкулах выклікалі да падзей асаблівы інтарэс.

Наш карэспандэнт пастараўся згадаць самыя цікавыя прыклады сумеснай рэалізацыі праектаў.

ШМАТПАВЯРХОВІКІ Ў ВІЦЕБСКУ...

На малой радзіме Марка Шагала вясной пазамінулага года гараджане, якія мелі права на атрыманне сацыяльнага жылля, справілі навасэлле ў мікрараёне «Білева-3». Дзесяціпавярховы 120-кватэрны дом стаў месцам пражывання для сірот, сем'яў, у якіх гадуюць дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, шматдзетных і г. д. А ў снежні 2018-га жыхары горада атрымалі ад кітайскіх сяброў яшчэ адзін падарунак – ключы ад кватэр у аналагічным сацыяльным доме па вуліцы Ленінградскай навасёлам уручаў пасол КНР у Беларусі Цуй Цымін.

СТАР. 3

Жыллёвая палітыка

Узводзіць дамы з айчынных матэрыялаў

Пры выдзяленні ўчасткаў перавага — арганізацыям, якія маюць уласныя вытворчыя магутнасці і займаюцца комплекснай забудовай

Як вядома, у сакавіку Прэзідэнт нашай краіны падпісаў Дырэктыву № 8 «Аб прыярытэтных кірунках развіцця будаўнічай галіны». Пастановай Савета Міністраў ад 14 мая гэтага года зацверджаны план мерапрыемстваў па рэалізацыі дырэктывы. Усяго ў яго ўключана больш за 60 мерапрыемстваў. Спецыялісты расказалі пра некаторыя з іх.

Жыллё і сацыялку будуе адзін заказчык

Адным з асноўных напрамкаў, прапісаных у прынятых зменах, будзе тое, што зямельныя ўчасткі для жыллёвага будаўніцтва зараз будуць выдзяляцца з умовай іх комплекснага развіцця, паведаміла **начальнік галоўнага ўпраўлення горадабудаўніцтва, праектнай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Вольга ВЕРАМЕЙ**.

СТАР. 5

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Генеральны сакратар ААН: Ціхі акіян можа быць атручаны радыеактыўнымі адходамі

Існуе небяспека атручвання Ціхага акіяна радыеактыўнымі адходамі, якія ўтварыліся ў выніку ядзерных выпрабаванняў, што праводзілі ЗША ў 1946—1958 гадах. Пра гэта заявіў на сустрэчы са студэнтамі ў Суве — сталіцы астраўной дзяржавы Фіджы — Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш.

Гутэрыш меў на ўвазе захаванне прыкладна 85 тысяч куб. м радыеактыўных адходаў пад бетонным купалам, зробленае Злучанымі Штатамі ў гіганцкім кратары, які ўтварыўся на востраве Руніт (атол Эніветак, Маршалавы астравы) пасля ядзернага выпрабавання ў маі 1958 года. Туды ж былі скінутыя заражаная глеба і радыеактыўны попел з іншых астравоў, на якіх Вашынгтон падрываў ядзерныя і вадародныя боезарады. Усе гэтыя адходы былі заліты бетонам таўшчынёй 45 см.

У бетоне, які дзесяцігоддзямі падпадае пад знешняе ўздзеянне, утварыліся расколіны, якія пад уплывам моцных трапічных цыклонаў будуць толькі павялічвацца. Гэта, у сваю чаргу, можа прывесці да поўнага разбурэння купала і ўцечкі радыеактыўных адходаў у акіян.

«Наступствы гэтага былі вельмі драматычныя ў тым, што датычыцца здароўя людзей і атручвання акіянскіх вод», — дадаў Генеральны сакратар.

З 1946-га да 1958 года Пентагон правёў на Маршалавых астравах 67 наземных, паветраных і падводных выпрабаванняў ядзернай зброі — прыкладна па адным выбуху кожныя два месяцы.

Венесуэла страціла $130 млрд з 2015 года ад дзеянняў ЗША

Страты Венесуэлы ад эканамічнай блакады ЗША з 2015-га да 2018 года склалі $130 млрд. Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі ў Маскве венесуэльскі пасол у РФ Карлас Рафаэль Фарыя Тартоса.

«У выніку эканамічнай блакады, уведзенай ЗША, страты ацэньваюцца ў $130 млрд за перыяд з 2015-га да 2018 года, — сказаў ён. — З гэтымі сродкамі наша краіна магла б ісці далей на працягу дзевяці гадоў». «Урад нашага прэзідэнта Нікаласа Мадура вядзе вельмі няроўную вайну супраць самай магутнай эканамічнай і ваеннай дзяржавы ў свеце — гэта ЗША», — падкрэсліў дыпламат.

Google спыняе супрацоўніцтва з Huawei. Што стане з прыладамі кітайскай кампаніі?

15 мая прэзідэнт ЗША Дональд Трамп падпісаў выканаўчы ўказ, які ўводзіць рэжым надзвычайнага становішча для абароны амерыканскай інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры ад замежных пагроз.

Зроблена гэта было на падставе таго, што кампанія «ўцягнута ў дзейнасць, якая супярэчыць нацыянальнай бяспецы ЗША і знешнепалітычным інтарэсам».

Пасля гэтага карпарацыя Google прыпыніла бізнес-кантакты з Huawei. Як пазней паведаміла агенцтва Bloomberg, пастаўкі сваіх распрацовак і праграмнага забеспячэння Huawei таксама замарозілі і іншыя кампаніі, у прыватнасці Intel.

На практыцы разрыў бізнес-кантактаў азначае, што Huawei пазбавіцца доступу да тэхналогій і праграмнага забеспячэння Google, за выключэннем тых прадуктаў, якія падаюцца ў адкрытым доступе. Так, напрыклад, Huawei страціць доступ да абнаўленняў сістэмы Android, якой аснашчаны смартфоны яе вытворчасці. Да таго ж кітайская кампанія не зможа ўсталёўваць праграмы Google, напрыклад магазін Google Play і электронную пошту Gmail, на наступныя мадэлі сваіх мабільных прылад.

КАРАТКА

- **«Беларускалій» пачынае будаўніцтва Дарасінскага рудніка.**
- Акцыя «Увага — дзеці!» стартуе ў Беларусі 25 мая, да 5 чэрвеня кіроўцы павінны будуць ездзіць з уключаным блізкім святлом.

- **Першая прадукцыя з граніту кар'ера Глушкавічы ў Лельчыцкім раёне выкарыстаная пры добраўпарадкаванні манумента Дружбы.**
- **Захваральнасць на меланому за 10 гадоў у краіне выросла ў 1,5 раза.**
- У сецівa трапіла адкрытая база з данымі больш чым 49 млн карыстальнікаў сацсеткі «Інстаграм».

Справы сямейныя

БАЦЬКІ «ВЫКРАДАЮЦЬ» ДЗЯЦЕЙ НА ЭМОЦЫЯХ,

а ў выніку — крымінальная справа ці абмежаваныя магчымасці малога

Святлана пазнаёмілася з Полем праз інтэрнэт, закахалася, паехала да яго ў Францыю, яны пажаніліся, нарадзілі дачку. Праз год жанчына паехала з немаўляці дадому ў Беларусь, адтуль патэлефанавала мужу, што не вернецца. Разлаваны тата напісаў заяву пра выкраданне малой. Цяпер на Святлану заведзена крымінальная справа і, выехаўшы за мяжу, яна можа быць дэпартавана ў Францыю і трапіць у турму... Генадзь і Таццяна скасавалі шлюб, суд вызначыў месца жыхарства іх сына з мамай. Жанчына ізноў выйшла замуж і з малым з'ехала за мяжу. Генадзь такім чынам страціў права доступу да дзіцяці і напісаў заяву з патрабаваннем вярнуць сына на радзіму. Прыйшлося жонцы дамаўляцца, каб экс-муж перыядычна размаўляў з дзіцем праз скайп, і аддаваць сына тату на канікулы... Гэтыя і мноства іншых гісторый заснаваны, як правіла, на чыстых эмоцыях, а не на пагрозе жыццю дзіцяці, лічаць спецыялісты. Аднак, згодна з Канвенцыяй аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей, наступствы такіх учынкаў могуць быць досыць сур'ёзнымі, бо перш за ўсё яна кіруецца інтарэсамі малога, а не праблемамі ў адносінах паміж іх бацькамі.

Інтэрнацыянальная сям'я: медыяцыя ў дапамогу

— Канвенцыя дзейнічае ў Беларусі больш за 20 гадоў. Падчас яе прымянення ўзнікаюць новая практыка і новыя пытанні. Цягам апошніх трох гадоў колькасць зваротаў па гвалтоўным вывазе дзяцей з краіны стабільна павялічваецца на адну заяву. У 2016-м праз Мінюст прайшло 14 зваротаў, у 2017-м — 15, летась — 16, — заўважыў **Алег СЛІЖЭЎСКІ, міністр юстыцыі Беларусі.**

Ён дадаў, што найчасцей такія сямейныя непаразуменні ўзнікаюць у беларусак з грамадзянамі Турцыі, Германіі, Італіі і шэрагу іншых краін.

Неўрэгуляваныя пытанні Канвенцыі неабходна адлюстраваць у нацыянальным заканадаўстве, упэўнены ў Мінюсце. У ведамстве падрыхтавалі праект закона, які карэктуе шэраг заканадаўчых актаў і ўжо ўнесены на разгляд у парламент.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

НАФТА, ЭКСПАРТ І ВУП

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Другі блок пытанняў — кампенсацыя Рэспубліцы Беларусь у сувязі са стратамі, панесенымі ў выніку гэтага інцыдэнту, — адзначыў прэм'ер-міністр. — Сёння, напэўна, рана казаць пра нейкія канкрэтныя лічбы, таму што ўся шкода яшчэ не падлічана беларускім бокам. Гэта працяглы працэс. Мы разлічваем, што для канчатковага вызначэння шкоды неабходны будзе яшчэ адзін месяц».

Сёння асноўная задача — вызваліць транзіт, каб наша краіна магла атрымліваць плату за нафту, якая ідзе праз яе тэрыторыю, дадаў Сяргей Румас.

Пра пастаўкі харчавання

Па тэме паставак харчавання прэм'ер-міністр нагадаў, што ёсць пералік беларускіх прадпрыемстваў, прадукцыя якіх не можа пастаўляцца ў Расію. Аднак Сяргей Румас прапанаваў паглядзець на праблему з іншага боку: сёння запасы па асноўных гандлёвых групах харчавання ў Беларусі складаюць ад 20 да 25 %.

«І па некаторых запасах мы практычна наблізіліся да ўзроўню, які неабходны для забеспячэння харчовай бяспекі краіны. Інакш кажучы, уся сельскагаспадарчая прадукцыя, якая вырабляецца ў Рэспубліцы Беларусь, прадаецца на знешнім або ўнутраным рынку. Адпаведна, мы будзем працягваць працаваць над тым, каб прадпрыемстваў, закрытых на тэрыторыю Расійскай Федэрацыі, не было. Але з пункту гледжання гандлю гэтымі таварамі ў нас вялікіх праблем няма. Яшчэ раз паўтаруся, што па многіх відах тавараў у нас сёння на складах практычна нічога няма. Уся прадукцыя прадаецца», — падкрэсліў ён.

Магчыма, для абароны нашых інтарэсаў неабходна больш актыўна дзейнічаць на пляцоўцы ЕАЭС?

«Мы спрабуем вырашыць пытанні бар'ераў (а гэта бар'ер для доступу нашай прадукцыі на расійскім рынку), падымаць на ўсіх пляцоўках. Менш, вядома, у СНД, больш — у Еўразійскім эканамічным саюзе і ў нашым двухбаковым парадку дня», — адзначыў Сяргей Румас.

Ён нагадаў, што на пасяджэнні Міжурадавага савета ЕАЭС у Ерэване беларускаму боку ўдалося правесці сваю прапанову — і Расія зняла сектаральныя абмежаванні на пастаўку беларускай прадукцыі. Гэта датычылася малака сухога і малака наліўнога ў вялікай тары. Паводле слоў прэм'ер-міністра, тады ўдзельнікі дамовіліся, што ні адна з краін не мае права сектаральна закрываць свой рынак для прадукцыі з іншай краіны.

«Калі ёсць праблемы з нейкім пэўным прадпрыемствам — нашы адпаведныя службы павінны адпрацоўваць механізмы і прымаць меры. Але закрываць цэлы сектар, цэлую галіну ні адна з краін не мае права. І ўсе краіны з гэтым пагадзіліся, а Расійская Федэрацыя адмяніла сваё рашэнне», — дадаў Сяргей Румас.

Пра ВУП і экспарт

«Што датычыцца росту эканомікі: за чатыры месяцы мы маем статыстыку, рост склаў 1,4 %. І гэта, у прынцыпе, адпавядае чаканням урада. Кожны месяц эканоміка дадае, і па паўгоддзі мы павінны выйсці на 1,8 %», — расказаў прэм'ер-міністр.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы на нарадзе раскрытыкаваў урад за нізкія тэмпы росту экспарту.

«Мы маем 98 % да мінулага года. Нягледзячы на тое што сальда лепшае, чым летась, ураду прыйдзецца прыняць дадатковыя меры разам з дзяржорганамі для таго, каб нагнаць адставанне ад плана — нашы планы былі 100,5 %. І вядома, выкананне гэтага задання запатрабуе дадатковых намаганняў ад дзяржаўных органаў», — дадаў Сяргей Румас.

Што датычыцца вядомай формулы дыверсіфікацыі экспарту (30/30/30), на жаль, за першыя тры месяцы бягучага года (за гэты перыяд ужо ёсць статыстыка) Беларусь не прасунулася да такіх аптымальных суадносін. Доля паставак у Еўразійскі эканамічны саюз па-ранейшаму дамінуе.

«Вырашаючы задачу ў цэлым — павелічэнне экспарту, — мы будзем разглядаць у тым ліку і яго таварную і краінавую дыверсіфікацыю», — паведаміў прэм'ер-міністр.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Напярэдадні

На медыйным парадку дня

Уплыў сацсетак на грамадскую думку і сучасныя тэхналогіі ў журналістыцы абмяркуюць у Брэсце

23—24 мая ў Брэсце пройдзе XIV Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства дзеля будучыні: журналістыка і сацыяльная абарона грамадства», які аб'яднае сёлета журналістаў і кіраўнікоў СМІ з 25 краін свету, ад Беларусі да Кітая, Італіі, Манголіі, Сербіі, ЗША. Удзел у абмеркаванні сучасных трэндаў, інфармацыйных выклікаў, тэхналогій і метадаў журналістыкі, ролі медыя ва ўмацаванні агульнагуманітарных каштоўнасцяў, наладжванні больш шчыльнага ўзаемадзеяння паміж краінамі і народамі возьмуць дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, дыпламаты, эксперты і практыкі — больш як 250 чалавек, у тым ліку каля 100 замежных гасцей.

Многія ўдзельнікі медыяфоруму прыбылі ў нашу краіну яшчэ ўчора і паспелі наведаць Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, дзе адбыўся спецыяльны брыфінг. Але асноўнай пляцоўкай мерапрыемства стане Рынькаўская сядзіба ў вёсцы Цюхінічы, што пад Брэстам. Пасля пленарнага пасяджэння, на якім будуць агучаны асноўныя тэзісы, удзельнікі працягнуць працу па секцыях у панэльных дыскусіях «Медыяпрастора і інфармацыйная бяспека», «Уплыў сацыяльных сетак і блогасферы на фарміраванне грамадскай думкі. Пашырэнне прысутнасці ў іх дзяржаўнага кантэнту», «Сучасныя трэнды інтэрнэт-журналістыкі і яе роля ў вырашэнні сацыяльна-палітычных праблем рэгіёнаў».

«Сёлета на форум заяўлена шмат дакладаў, звязаных з уплывам сацыяльных сетак на грамадскую думку, меркаванне спажыўцоў інфармацыі. Мы пастараліся запрасіць тых экспертаў, якія працуюць у гэтай сферы і дапамогуць сфарміраваць сапраўды актуальны парадак дня», — адзначыў **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.**

Акрамя таго, ужо традыцыйна ў другі дзень форуму пройдзе Летняя школа журналістыкі — на базе Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Яе тэмай стане «Сучасная журналістыка і сацыяльныя медыя», а ў раскладзе заняткаў — шэраг майстар-класаў для маладых журналістаў. У прыватнасці, пра сучасныя тэхналогіі ў тэлевізійнай вытворчасці і ролю блогераў у прасоўванні кантэнту раскажуць прафесіяналы з Беларусі і Расіі: старшыня Белтэлерадыёкампаніі Іван Эйсмант, кіраўнік тэлеканала АНТ Марат Маркаў, генеральны дырэктар радыёстанцыі «Гаворыць Масква» Уладзімір Мамантаў, вядомы рэпарцёр канала «ТБ Цэнтр», лаўрэат прэміі «ТЭФІ» Раман Бабаян і іншыя.

Таксама 24 мая адбудзецца круглы стол «Саюзная дзяржава: 20 гадоў у медыяпрасторы. Вынікі і перспектывы». А завершыць праграму мерапрыемстваў экскурсія «Ніхто не забыты, нішто не забыта», падчас якой удзельнікі і госці форуму наведаюць мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Мангольскія госці форуму

У Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь напярэдадні XIV Беларускага міжнароднага медыяфоруму адбылася сустрэча з удзельнікамі гэтага праекта — прадстаўнікамі Манголіі.

Сваімі развагамі пра беларуска-мангольскае медыйнае супрацоўніцтва падзяліліся прэзідэнт Канфедэрацыі мангольскіх журналістаў, пісьменнік і журналіст, заслужаны дзеяч культуры Манголіі спадар Бадам-Ачыр Галаарыд і кіраўнік консульскага агенцтва Манголіі ў Рэспубліцы Беларусь спадар Санома Цагаа. Размова ішла пра арганізацыю прэс-тура беларускіх журналістаў ва Улан-Батар, пра тое, што варта шырэй паказваць эканамічнае супрацоўніцтва нашых краін, якое набірае хуткасці. Як у галіне набыцця Манголіяй беларускай тэхнікі, так і ў арганізацыі адносін у сельскагаспадарчай вытворчасці. У прыватнасці, ідзе прапрацоўка стварэння з дапамогай беларускага боку малочнага кластара ў Манголіі.

Спадар Галаарыд прэзентаваў у час сустрэчы кнігу перакладаў санетаў Янкі Купалы на мангольскую мову, якая толькі што пабачыла свет ва Улан-Батары. Перакладчык і ініцыятар гэтага выдання зазначыў, што ўжо зараз у кнігавыданні Манголіі плануюцца новыя праекты, якія прадставяць мангольскаму чытачу беларускую літаратуру. Таксама ў час сустрэчы была звернута ўвага і на асвятленне ў мангольскіх масмедыя II Еўрапейскіх гульняў, якія праз некалькі тыдняў будзе прымаць Беларусь. Удзел у сустрэчы з беларускага боку прынялі міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч і дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак.

Сяргей ШЫЧКО.

Эканамікс

УМОВЫ СПРЫЯЛЬНЫЯ, ПРАПАНОВЫ ПРЫВАБНЫЯ

Віцебскі інвестыцыйны форум «Інавацыі. Інвестыцыі. Перспектывы» сёлета стаў рэкардсменам па колькасці замежных удзельнікаў, новаўвядзенняў і цікавых прапаноў. У мерапрыемстве паўдзельнічалі больш за 500 прадстаўнікоў дзелавых колаў прыкладна з 20 краін. Форум адбыўся ў самым цэнтры старажытнага горада — Летнім амфітэатры.

Старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Мікалай ШАРСНЁЎ, вітаючы ўдзельнікаў, адзначыў, што ў Віцебшчыны вельмі выгаднае геаграфічнае становішча, а таксама ў краіне створаны вельмі прыцягальныя для патэнцыйных інвестараў умовы для дзейнасці.

У рэгіёне насамрэч ёсць унікальныя прапановы для ахвотных стварыць прадпрыемства, распачаць зарабляць на турызме, аказанні паслуг і гэтак далей. Інвестараў, напрыклад, зацікавіла адпрацоўка новай мадэлі бізнес-дзейнасці ў Аршанскім раёне, дзе дадзены значныя прэферэнцыі. Умовы, аб якіх мараць у развітых краінах, дазволяць акупляць ўкладзеныя грошы за параўнальна невялікі час.

Намеснік міністра эканомікі Рэспублікі Беларусь Дзмітрый ЯРАШЭВІЧ канстатаваў, што ў краіне зроблены значны скачок па стварэнні прывабных умоў для бізнесу. Усяго за дзесяць гадоў у рэйтынгу Сусветнага банка з 110-й пазіцыі Беларусь перамясцілі ў спіс сарака самых прывабных для інвестараў краін. У дзесяць разоў скарацілі патрабаванні: санітарныя, тэхналагічныя, ветэрынарныя і іншыя.

Спікеры на форуме адзначалі, што актывізацыі бізнесу, навукі, спорту і турызму паспрыяў бязвізавы рэжым. Ён актывізаваў і інвестыцыйную дзейнасць.

Дзелавыя людзі падчас дыскусій на мерапрыемстве не раз агучвалі, што беларускае інвестыцыйнае заканадаўства адпавядае найлепшым аналагам у свеце.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Індыі ў Беларусі Сангіта БАХАДУР, выступаючы перад удзельнікамі форуму, адзначыла, што адной з прыцягальных умоў для інвестараў з'яўляецца цудоўная прыгажосць беларускай прыроды.

Дарэчы, на Віцебшчыне вельмі выгадна зарабляць на турызме. Упершыню ў краіне больш за 210 участкаў вызначаны ў самых маляўнічых і экалагічна чыстых месцах. Напрыклад, на больш чым ста азёрах інвестары у заяўляльным парадку могуць заняцца арганізацыяй турызму, адпачынку, аздараўлення. Што да канкрэтных прапаноў, то патэнцыйным інвестарам на бізнес-мерапрыемстве прапаноўвалі купіць сажалкавую гаспадарку па вырошчванні і перапрацоўцы рыбы. Ёсць магчымасць укласці грошы ў развядзенне авечак новай для Беларусі пароды, якую фермер прывёз з Ленінградскай вобласці. На выстаўцы дэманстраваліся ўнікальныя пад'ёмнікі, якія вырабляюцца ў Віцебскай вобласці, сельскагаспадарчая тэхніка, станкі і іншае.

Сярод цікавых праектаў быў прадстаўлены і кластар устаноў адукацыі. **Дырэктар віцебскай СШ № 29 Ірына ШУШКЕВІЧ** прэзентавала адну з распрацовак. Педагогі школы стварылі вучэбна-метадычны комплекс па навучанні дзяцей і бацькоў фінансавай адукаванасці. Гэта дазволіць зацікавіць беларусаў магчымасцю распачаць сваю справу.

На форуме было падпісана больш за дзесяць пагадненняў. Сярод іншых — і органамі ўлады. Напрыклад, дарожная карта — паміж аблвыканкамам і ўрадам Саратаўскай вобласці — аб гандлёва-эканамічным, культурным і гуманітарным супрацоўніцтве.

Замежныя бізнесмены і дыпламаты з вялікай цікавасцю назіралі за першым у рамках форуму абласным конкурсам маладзёжнага руху WorldSkills. Міжнародныя чэмпіянаты WorldSkills праводзяцца раз на два гады ў розных краінах. Іх мэта — вызначыць найлепшых прадстаўнікоў рабочых прафесій. У Віцебску клас паказвалі, у прыватнасці плітачнікі, муляры, швачкі... Зразумела, што пры стварэнні прадпрыемстваў неабходны высокапрафесійныя кадры, якія адпавядаюць патрабаванням часу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Не прапусці!

Акадэмік пераселіцца ў акіян,

або Навукова-папулярны падыход да роднай прыроды

З 22 да 29 мая навуковыя арганізацыі Аддзялення біялагічных навук НАН Беларусі ўпершыню арганізуюць Тыдзень роднай прыроды. Мерапрыемства прысвечана Году малой радзімы. НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах, Інстытут эксперыментальнай батанікі, Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі і Інстытут лесу падрыхтавалі цэлы шэраг цікавых мерапрыемстваў.

Так, **22 мая** ў Інстытуце эксперыментальнай батанікі адбудзецца семінар-адкрыццё, прысвечаны Міжнароднаму дню біялагічнай разнастайнасці. **23 мая** ў інстытуце пройдуць батанічны і заалагічны чацвяргі: будзе прачытана лекцыя «Ацэнка 25-гадовай дынамікі ляснога покрыва на закінутых сельскагаспадарчых землях прыгранічных раёнаў Расіі і Беларусі па спадарожнікавых даных» і тэматычныя лекцыі вядучых навукоўцаў-заолагаў па праблеме захавання зуброў.

У гэты ж дзень стартуе IX Міжнародны навукова-практычны і навучальны семінар для студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, выкладчыкаў і работнікаў спецыяльнасці «Лясная гаспадарка» («Лясная справа») на тэму «Дынаміка, стан і маніторынг лясных экасістэм на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях». Маленькіх мінчан і гасцей сталіцы парадуе цырымонія перасялення акулёнка па імені Акадэмік, які цяпер знаходзіцца ў адмысловым інкубатары, у мабільны музей-лабараторыю «Адкрыты акіян».

24 мая ў Цэнтральным батанічным садзе адбудуцца экскурсіі «Прыродная флора ў экспазіцыях і калекцыях Цэнтральнага батанічнага сада» і «Дэкаратыўныя расліны прыроднай флоры Беларусі». Вядучыя навукоўцы выступяць з лекцыямі-прэзентацыямі «Грыбы ў нашых лясах», «Лес і клімат», «Інвазійныя расліны Беларусі: мінулае, сучаснасць і будучыня».

У суботу і нядзелю, **25—26 мая**, з 10.00 да 18.00 у Цэнтральным батанічным садзе разгорнецца гульнявы сямейны фестываль «TOYDAY». Плануецца, што наведвальнікі змогуць не толькі ўбачыць рэдкія і знікаючыя віды раслін, але і набыць іх узоры ў краме сада.

28—29 мая адбудзецца І Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Веды і палітычныя інавацыі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя паміж Захадам і Усходам: вывучаныя і не вывучаныя ўрокі».

На працягу ўсяго Тыдня роднай прыроды вядучыя навукоўцы арганізацый Аддзялення біялагічных навук НАН Беларусі будуць выступаць перад грамадскасцю, у сродках масавай інфармацыі, прымуць удзел у прэзентацыях і святочных мерапрыемствах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Будзь у курсе!

Тарыфы за паслугі таксі «кусаюцца»?

МАРГ заклікае паведамляць пра такія выпадкі

Прапанова міністэрства датычыцца перыяду правядзення ў Мінску II Еўрапейскіх гульняў. Усе, хто лічаць, што пры аказанні паслуг таксі былі выкарыстаны занадта высокія тарыфы, могуць паведаміць пра гэта ў МАРГ, дзе прымуць адпаведныя меры па факце ў рамках сваёй кампетэнцыі, калі ён пацвердзіцца.

Мемарандум аб гарантаваным узроўні тарыфаў на паслугі аўтамабільных перавозак пасажыраў аўтамабілямі таксі ў перыяд правядзення II Еўрапейскіх гульняў быў падпісаны яшчэ ў лістападзе мінулага года паміж міністэрствамі антыманапольнага рэгулявання і гандлю, транспарту і камунікацый, Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам і прадстаўнікамі найбуйнейшых дыспетчарскіх службаў сталіцы.

З 15 чэрвеня па 5 ліпеня тарыфы не павінны быць вышэй за ўзровень, які быў па стане на 1 красавіка гэтага года.

У выпадку выяўлення іншага зварот у МАРГ можна падаваць як у электронным выглядзе, так і ў пісьмовым па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Кірава, 8, корп. 1. Пры гэтым трэба ўказваць інфармацыю пра сябе, расказаць пра сутнасць пытання: дата, час, маршрут здзейсненай паездкі, звесткі пра перавозчыка, нумар дзяржаўнай рэгістрацыі (спецыяльны нумар) транспартнага сродку, марка (мадэль) аўтамабіля, наяўнасць інфармацыйнай эмблемы (лагатыпа), якая пазначае перавозчыка, што заключыў дагавор.

Справа ў тым, што, як звяртае ўвагу МАРГ, узровень тарыфаў на паслугі таксі ў перыяд правядзення II Еўрапейскіх гульняў гарантаваны ў дачыненні да дыспетчарскіх службаў таксі, якія падпісалі Мемарандум. Іншыя перавозчыкі аўтамабіляў таксі, у прыватнасці тыя, якія прапануюць паслугі «ад борта», у адпаведнасці з заканадаўствам, фарміруюць тарыфы самастойна, іх узровень нарматыўнымі прававымі актамі не абмежаваны.

Пералік дыспетчарскіх службаў таксі, якія падпісалі Мемарандум, размешчаны на афіцыйным сайце МАРГ. Транспартныя сродкі дыспетчарскіх службаў таксі — удзельніц Мемарандума пазначаны лагатыпам, азнаёміцца з якім можна там жа.

ДАРЭЧЫ

Днямі шырокі рэзананс выклікала гісторыя, калі ў сталіцы таксіст, які працуе «ад борта», прапанаваў пасажырцы, жыхарцы Лунінецкага раёна, заплаціць за паездку ад Чыгуначнага вакзала да вуліцы Маякоўскага (гэта каля двух кіламетраў, як паведамлялася) 73 рублі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

На канікулы — без траўмаў

Штогод у Беларусі рэгіструецца каля 750 тысяч траўмаў, з якіх 140—150 тысяч — у дзяцей і падлеткаў-пешаходаў. Пры гэтым калі за мінулыя дзесяць гадоў 80 % здарэнняў адбыліся па віне апошніх, дык цяпер 78 % выпадкаў — наступствы няўважлівасці кіроўцаў.

Ганна БАНАДЫК, старшы інспектар па асаблівых даручэннях аддзела арганізацыі міжведамаснага ўзаемадзеяння і прапаганды бяспекі дарожнага руху УДАІ міліцыі грамадскай бяспекі МУС адзначыла, што сёлета Дзяржаўтаінспекцыя будзе працаваць па трох кірунках: прафілактыка дзіцячага траўматызму напярэдадні летніх канікул, работа з бацькамі па выхаванні адказных адносін да дзяцей у пытаннях дарожнай бяспекі і стварэнне спрыяльных умоў для дзяцей у соцыуме.

— За апошнія чатыры месяцы назіраецца зніжэнне колькасці дарожных здарэнняў з дзецьмі з 90 да 78 чалавек. Пры гэтым колькасць загінулых засталася на ўзроўні мінулага года. Нягледзячы на дзеючы закон 2015 года, які прадугледжвае перавозку дзяцей у аўтамабілі з выкарыстаннем дзіцячых утрымлівальных крэслаў, бацькі часта гэтым грэбуюць. Таму важна праводзіць прафілактычную работу не толькі з дзецьмі, але і з дарослымі. Трэба памятаць і пра тое, што з надыходам цёплай пары з'явілася небяспека з'яўлення траўмаў у дзяцей падчас язды на веласіпедах, самакатах, роліках. У Мінску за апошнія некалькі тыдняў ужо зарэгістравана тры такія выпадкі.

Ганна РЫСЯВЕЦ, начальнік аддзела выхаваўчай і ідэалагічнай работы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама расказала, што ў Мінскім гарадскім інстытуце развіцця адукацыі педагогамі праводзіцца адукацыйны комплекс для дзяцей, у розных лагерах, перынатальных цэнтрах і санаторыях расказваецца пра важнасць бяспечных паводзінаў у грамадстве, ва ўсіх установах адукацыі аддаецца вялікая ўвага бацькоўскім сходам, дзе ўздымаецца тэма бяспекі дзяцей і іх паводзінаў у соцыуме.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Здарэнне

Школьнік трапіў пад электрадугу

У Мінску хлопчык рабіў фотасесію на даху цягніка і трапіў у бальніцу: яго ўдарыла токам.

Здарэнне адбылося пасля дзевяці гадзін вечара на вуліцы Каржанеўскага. Паведамленне пра гэта ратавальнікам паступіла ад дзяжурнага па станцыі Мінск-Сарціровачны. Пацярпелы, вучань восьмага класа, верагодна, праводзіў фотасесію на даху грузавога вагона пад кантактнай сеткай электрыфікаванай чыгункі. У нейкі момант хлопчыка ўдарыла токам, у выніку чаго ён атрымаў траўмы і апёкі, з якімі школьніка шпіталізавалі ў бальніцу ў цяжкім стане. Прычыны здарэння высвятляюцца. Найбольш верагодная версія — асабістая неасцярожнасць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШАКАЛАДНЫЯ САКРЭТЫ ПОСПЕХУ

У конкурсе «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», які праводзіць Дзяржстандарт сумесна з абласнымі выканаўчымі камітэтамі і Мінскім гарвыканкамам, былі адзначаны 274 тавары (харчовыя і прамысловыя вырабы, прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння). Сярод лаўрэатаў — 27 сталічных прадпрыемстваў. Лагатып, які сведчыць пра высокую якасць тавару, з'явіцца на ўпакоўках хлебабулачных вырабаў, напоях, марожаным, прамысловых таварах, галаграмах, касметыцы і іншых. У асобнай намінацыі разглядаліся заслугі прадпрыемстваў, якія аказваюць паслугі насельніцтву. Так, былі адзначаны турыстычнае агенцтва і «Мінскводаканал».

Акрамя таго, шэсць сталічных прадпрыемстваў атрымалі статус «Навінка года». Чатыры, якія на працягу некалькіх гадоў пацвярджаюць высокія вынікі сваёй працы, ганараваны дыпломамі «Стабільная якасць».

Намеснік старшыні Мінгарвыканкама Аляксандр КРЭПАК адзначыў, што сталічныя прадпрыемствы сёння могуць годна прадстаўляць Беларусь у многіх краінах свету. Тут ствараецца багата інавацыйных тавараў. Калектывы шукаюць новыя рашэнні, мадэрнізуюць ці набываюць абсталяванне, ствараюць сучасныя рэцэптуры, знаходзяць новыя тэхналогіі. І падчас II Еўрапейскіх гульняў нам будзе чым парадаваць і ўразіць вялікую колькасць гасцей, што прыбудуць у краіну.

У гэтым годзе ўрачыстая цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў прайшла на базе фабрыкі «Камунарка», дарэчы, таксама лаўрэата дадзенага конкурсу. І як заўважылі госці, было б добрай традыцыяй кожны год падводзіць вынікі ў сценах аднаго з прадпрыемстваў горада, дзе вытворцы могуць знаёміцца з напрацоўкамі калег, абменьвацца вопытам. Так, падчас экскурсіі гасцям расказалі пра тое, як адрозніць сапраўдны шакалад (ён растае пры тэмпературы 29—31 градус), паказалі высокатэхналагічнае абсталяванне (тут ёсць лініі, на якіх магла б вырабляцца прадукцыя, аналагічная «марсам» і «снікерсам», а ў хуткім часе будзе запушчана ўнікальнае абсталяванне, якое дазволіць вырабляць салодкую прадукцыю метадам халоднай штампоўкі) і, канешне, фабрыка дзялілася сакрэтамі поспеху (мадэрнізацыя вытворчасці, увага якасці прадукцыі, натуральныя інгрэдыенты, і, вядома, вялікая работа па прасоўванні прадукцыі на ўнутраным і знешнім рынках).

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Члены Савета Рэспублікі, Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі выказваюць глыбокія спачуванні намесніку Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Баляславу Казіміравічу Пірштуку ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

ЖЫЛЛЁ, ЭНЕРГЕТЫКА І БЛІЗКАЕ ЗНАЁМСТВА

Першы дом у віцебскім Білеве, пабудаваны пры дапамозе КНР.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэта — добрыя прыклады супрацоўніцтва з Беларуссю ў рамках фінансава-тэхнічнай дапамогі Паднябеснай у сферы будаўніцтва жылля сацыяльнага прызначэння. Усе выдаткі — ад праектавання да фінансавання будаўніцтва — узяў на сябе кітайскі бок.

Звонку, дарэчы, дом у Білеве на вуліцы акцёраў Яроменкаў нічым не адрозніваецца ад іншых, пабудаваных па аналагічным праекце, адно што на фасадзе ёсць інфармацыя аб дапамозе Кітая.

— Сюды мы засяліліся два гады таму. Раней я, мама і брат жылі на праспекце Чарняхоўскага з бабуляй. У гэтым доме ў нас двухпакаёвая кватэра. Якасць жылля задавальняе, — расказвае **Аляксандр Васіленка.** Ён вучыцца ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, адначасова працуе ў кампаніі мабільнай сувязі.

Маладая мама прадставілася Марыяй, яна расказала, што ў доме добры ліфт, у які без праблем умяшчаецца каляска.

— Гэта зручна... Раней жылі ў кватэры ў доме на вуліцы П. Броўкі ў цеснаце... Тут, канешне, прасторнае жыллё, — кажа гараджанка.

Яшчэ адзін жыхар дома Раман — рабочы дзяржаўнага прадпрыемства.

— Я ў гэтым доме з моманту засялення. Да гэтага жылі з мамай на вуліцы В. Церашковай. Тут у двухпакаёвай кватэры з жонкай і дзіцем. Падабаецца раён, бо вельмі спакойны і побач лес, — паведаміў суразмоўнік.

Вельмі добра пагутарылі з яшчэ адной жыхаркай. **Валянціна Паўлаўна Княжышча** прагульвалася з унучкай, дзяўчынкай з абмежаванымі магчымасцямі. Раней жанчына працавала ў садку. Улічваючы стан здароўя ўнучкі, якой у хуткім часе будзе дзевяць гадоў, цяпер даглядае яе.

Суседзі ў яе пад'ездзе дружныя: разам кветкі высаджваюць каля дома, калі нешта здарыцца, прыходзяць на дапамогу адно аднаму... Стасункі вельмі шчырыя, як у двух народаў: беларускага і кітайскага, кажа жанчына.

У абласным цэнтры гэты прыклад не адзіны. Недалёка ад чыгуначнага вакзала — на вуліцы Ленінградскай — навасёлы не раз добрым словам прыгадаюць клопат з далёкай краіны. Там, таксама ў дзесяціпавярховым доме, у канцы мінулага года справілі навасселце тутэйшыя, якім гарантавана сацыяльная падтрымка. Надзвычайны і Паўнамоцны пасол КНР у Беларусі Цуй Цымін падчас уручэння ключоў падкрэсліў, што будаўніцтва жылля ў Віцебску будзе працягвацца.

...І Ў ГЛЫБІНЦЫ

Паралельна з узвядзеннем «метраў» у абласным цэнтры кітайская бязвыплатная будаўнічая дапамога запатрабавана ў глыбінцы.

У прыватнасці, у межах рэспубліканскага праекта «Будаўніцтва сацыяльнага жылля» ў 2017 годзе ў Оршы быў здадзены дзевяціпавярховы 108-кватэрны дом. У Наваполацку мінулай восенню справілі навасселце ў 84-кватэрным доме сацыяльнага прызначэння. Ён пабудаваны па аналагічным «алгарытме». А ў суседнім Полацку гарадскую забудову дапоўніў 92-кватэрны дом-прыгажун. У Лепелі для тутэйшых былі прызначаныя 40 кватэр у такім жыллі...

Будаўніцтва па «кітайскай сістэме» працягвалася і ў іншых населеных пунктах Віцебшчыны.

Калі генпадрадчык — кітайская арганізацыя, беларускі бок працуе па субпадрадзе. Жыллё адпавядае беларускім стандартам і па якасці, а тым больш па зручнасці для жыльцоў нічым не адрозніваецца ад «сабратаў» айчыннай вытворчасці.

Жыллё, дарэчы, «інтэлектуальнае»: з сучаснымі сістэмамі вентыляцыі, збярожэння энергіі, з мінімумам небяспекі для навакольнага асяроддзя.

Фота БелТА

Святлана ЕМЯЛЬЯНАВА з дачкой Карынай цяпер жывуць у новым доме на Ленінградскай.

«ЭНЕРГАСЦЯНА» НА ДЗВІНЕ

Падчас «Вялікай гутаркі з Прэзідэнтам» у якасці прыкладу паспяховага супрацоўніцтва з КНР кіраўнік дзяржавы назваў гідраэлектрастанцыю на Заходняй Дзвіне.

У 2013 годзе на адной з самых працяглых рэк краіны Кітайская інжынерная кампанія па электраэнергіі (CNEEC) пачала будаўніцтва найвялікшай гідраэлектрастанцыі ў Беларусі. Яна мае чатыры турбіны, кожная з якіх — магутнасцю 10 МВт. Уведзена ў эксплуатацыю яна ў ліпені 2017 года.

Штогод на ГЭС магчыма вырабляць каля 140 мільёнаў кілават-гадзін электраэнергіі. Гэтага, як канстатуюць энергетыкі, з лішкам хопіць, каб забяспечыць патрэбы спажыўцоў Віцебскага раёна і не толькі.

Дарэчы, адна з галоўных водных артэрый краіны на гэтым участку пасля ўзвядзення станцыі засталася суднаходнай. У Віцебскім райвыканкаме адзначаюць, што гэта дазволіць прыцягнуць яшчэ больш аматараў воднага турызму. Магчымасць прайсці знакамітым водным шляхам «З варагаў у грэкі» вабіць усё больш беларусаў і іншаземцаў. Такім чынам, можна будзе выкарыстаць гідраэлектрастанцыю і для арганізацыі актыўнага адпачынку.

АДЗІН З АСНОЎНЫХ ПАРТНЁРАЎ

Знешнегандлёвае супрацоўніцтва з КНР на Віцебшчыне стабільнае. У сярэднім штогод у гэтую краіну экспартуецца прадукцыі на суму каля дзесяці мільёнаў долараў ЗША. Калі не лічыць супрацоўніцтва з расіянамі, менавіта Кітай традыцыйна знаходзіцца ў пяцёрцы асноўных гандлёвых партнёраў вобласці па аб'ёме тавараабароту разам з Нідэрландамі, Вялікабрытаніяй, Германіяй і Польшчай.

Асноўныя прадпрыемствы-экспарцёры, якія маюць вопыт працы на кітайскім рынку і экспартуюць сваю прадукцыю, — ААТ «Нафтан», ААТ «Полацк-Шкловалакно», Аршанскі льнокамбінат. У КНР таксама высока ацанілі прадукцыю Віцебскага маслаэкстракцыйнага завода, Віцебскага лікёра-гарэлачнага завода «Прыдзвінне», холдынга «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка» ды іншых. Усяго экспарт прадукцыі ажыццяўлялі каля дваццаці прадпрыемстваў вобласці. А сярэднегадавы аб'ём тавараабароту вобласці з кітайскімі партнёрамі за апошнія пяць гадоў складае каля 120 мільёнаў долараў. Максімальны аб'ём тавараабароту адзначаўся ў 2012—2013 гадах і дасягаў 280 мільёнаў долараў.

Як паведамілі ва ўпраўленні знешнеэканамічнай дзейнасці Камітэта эканомікі Віцебскага аблвыканкама, аснову імпарту з КНР складаюць матэрыялы для вытворчасці абутку, сыравіна для харчовай, лёгкай і хімічнай галін прамысловасці, лекі і паўфабрыкаты, інсектыцыды, інструменты.

Прадпрыемствы-экспарцёры рэгулярна ўдзельнічаюць у міжнародных выстаўках на тэрыторыі Кітая, у прыватнасці ў штогадовай выстаўцы-кірмашы ў Харбіне. У першай Кітайскай міжнароднай выстаўцы імпарту ў Шанхаі, што прайшла ў лістападзе 2018 года, прынялі ўдзел дзесяць прадпрыемстваў Віцебскай вобласці. Там была прадстаўлена прадукцыя нафтахімічнай галіны, мяса-малочная, а таксама льняная. Дарэчы, нядаўна на пасяджэнні аблвыканкама губернатар Мікалай Шарснёў адзначыў, што кітайскі бок агучыў жаданне пабудаваць з нуля льнозавод. Цікава, што дзякуючы крэдытаванню аднаго з банкаў Паднябеснай у 2015—2017 гадах быў рэалізаваны інвестпраект па мадэрнізацыі вытворчасці на Аршанскім ільнокамбінаце. Памер інвестыцый перавысіў 129 мільёнаў рублёў.

КІТАЙСКАЯ МОВА З ДЗЯЦІНСТВА...

На Віцебшчыне расце колькасць навучэнцаў, якія вывучаюць кітайскую мову ў якасці замежнай. Напрыклад, у бягучым годзе яе асвойваюць больш за 220 школьнікаў з абласнога цэнтра і Оршы. А каля дзесяці ўстаноў адукацыі Аршанскага раёна маюць факультатыўныя заняткі, якія вядуць валанцёры з КНР.

Мінулай восенню пры падтрымцы Пасольства КНР у Беларусі ў віцебскай СШ № 44 адкрыўся першы ў вобласці клас Канфуцыя. Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт паспяхова рэалізуе праект акадэмічнай мабільнасці з Хейлундзянскім універсітэтам. Цяпер у ВНУ-партнёры праходзяць навучанне студэнты гуманітарнага і фінансава-эканамічнага факультэтаў. У Полацкім дзяржуніверсітэце цэнтр Канфуцыя ажыццяўляе дзейнасць па выкладанні мовы, эканомікі і традыцыйнай культуры.

Універсітэтам падпісаны новыя дагаворы аб супрацоўніцтве з Ліннаньскім універсітэтам і Ланьчжоўскім транспартным універсітэтам. Згодна з дамоўленасцямі, плануецца стварэнне сумесных праграм навучання, а таксама запрашэнне кітайскіх грамадзян на вучобу ў Беларусь.

Некалькі гадоў у Віцебскім дзяржаўным універсітэце на платнай аснове праводзіцца летняя адукацыйная праграма для кітайскіх студэнтаў. У 2017 годзе ў рамках гадавой культурна-адукацыйнай праграмы вывучалі рускую мову і пазнаёміліся з культурнай спадчынай Беларусі трыццаць студэнтаў з Пекіна.

... І АЗДАРАЎЛЕНЧЫЯ ПРАКТЫКІ

Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт (ВДМУ) — адзін з самых паважаных яшчэ з часоў СССР. Ён падтрымлівае сувязі з Куньмінскім медыцынскім універсітэтам. Сюды рэгулярна запрашаюць кітайскіх калег для ўдзелу ў навукова-практычных канферэнцыях, якія праходзяць на базе ўніверсітэта.

Дзейнічае дагавор аб супрацоўніцтве ВДМУ з навукова-тэхнічным інвестыцыйным холдынгам FOHOW. У яго рамках ажыццяўляюцца міждысцыплінарныя напрамкі работы факультэта «Здароўезберажэнне» сумесна з супрацоўнікамі навукова-даследчага інстытута FOHOW.

У рамках праекта «Славянска-кітайскія аздараўленчыя практыкі» працуюць групы здароўя «Цыгун» — для людзей сярэдняга і старэйшага ўзростаў. Аднайменны комплекс уведзены па дысцыпліне «Фізічная культура» для студэнтаў спецыяльных медыцынскіх груп з парушэннем апорна-рухальнага апарата і захворваннямі органаў дыхання.

Летась у Віцебскім абласным клінічным цэнтры медыцынскай рэабілітацыі для інвалідаў і ветэранаў-інтэрнацыяналістаў адкрыты Цэнтр традыцыйнай кітайскай медыцыны. На працягу першых дзесяці месяцаў функцыянавання цэнтр наведала каля тысячы пацыентаў.

КУЛЬТУРА БЕЗ МЕЖАЎ

На базе Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці на працягу мінулага года праводзіліся ўрокі традыцыйнай культуры, майстар-класы для кітайскіх студэнтаў ВНУ Віцебска.

Кітайскі дуэт «Chinese Men» з горада Хух-Хота сумесна са студэнтамі ВДУ імя П. М. Машэрава ўдзельнічаў у XXVII Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

А яшчэ становіцца традыцыйным фестываль «Вясна з вясною сустрэліся», які прайшоў летась у Оршы. Ён сімвалізуе яднанне дзвюх культур — Беларусі і Кітая.

Летась у Віцебскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі з удзелам студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў і школьнікаў прайшоў Дзень кітайскай культуры. Сумесна з дзяржаўным архівам вобласці арганізавана выстаўка «Другая радзіма», якая расказвала пра жыццё кітайцаў на Віцебшчыне і адзіны на тэрыторыі Беларусі кітайскі калгас «Кантонская камуна», што дзейнічаў у 20—30-х гадах мінулага стагоддзя. Як гэта было? Пад Віцебск жыхары Паднябеснай прыехалі не дзеля пошуку экзотыкі. У Кітаі зямлі ў селяніна было мала, пракарміцца нават невялікай сям'і было цяжка. Таму і шукалі магчымасці працаваць за тысячы кіламетраў ад радзімы. Больш за 40 чалавек прыехалі ў Віцебск і наваколле ў 1922-м. Яны браліся за самую цяжкую працу, якой неахвотна займаліся тутэйшыя. У 1928-м каля дзесяці сем'яў атрымалі амаль дваццаць гектараў недалёка ад горада. Кітайцы пачалі вырошчваць агародніну і садавіну, потым заняліся льном. Росквіт гаспадаркі быў у сярэдзіне 1930-х. Цікава, што ў калгасе быў млын — адзіны ў акрузе. Усе пасяленцы жылі заможна, трымалі жывёлу, добра зараблялі сваёй нялёгкай працай, не раз станавіліся героямі публікацый у газетах і часопісах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Фота БелТА

Нона МАКАРАВА з сынам Арцёмам і дачкой Дзіянай былі рады прыемнаму падарунку да Новага года.

З гісторыі пытання

Дружба, раўнапраўе, узаемная выгада

Што такое Дырэктыва Прэзідэнта № 5?

...10 мая 2015 года старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін прыляцеў у Беларусь. Пасля афіцыйнай цырымоніі сустрэчы ў Палацы Незалежнасці беларускі і кітайскі лідары правялі перагаворы ў пашыраным фармаце і вузкім складзе, па выніках якіх падпісалі пакет дакументаў. Сярод іх — Дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Кітаем, а таксама сумесная дэкларацыя аб далейшым развіцці і паглыбленні адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства.

Акрамя таго, тады ж былі падпісаны два дзясяткі пагадненняў і мемарандумаў — гэта зрабілі прадстаўнікі афіцыйных дэлегацый.

Візіт у Беларусь у старшыні КНР атрымаўся насычаным — і ў фінальны дзень візіту кіраўнікі дзяржаў наведалі месца першага этапу будаўніцтва Кітайска-беларускага індустрыяльнага парку, дзе пакінулі свае подпісы на плане развіцця парку.

Праз некалькі месяцаў пасля знамянальнага візіту і з'явілася Дырэктыва № 5.

Гэта дакумент ад 31 жніўня 2015 года, прысвечаны развіццю двухбаковых адносін Беларусі з Кітайскай Народнай Рэспублікай. У прыватнасці, у Дырэктыве сказана, што развіццё адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства нашай краіны з КНР адпавядае доўгатэрміновым інтарэсам Беларусі і ўмацаванню яе міжнародных пазіцый, спрыяе забеспячэнню развіцця ўсяго спектра беларуска-кітайскага супрацоўніцтва.

Таксама ў дакументе падкрэсліваецца, што асноўным зместам двухбаковага супрацоўніцтва з'яўляецца ўзаемная рашучая падтрымка па пытаннях, якія датычацца карэнных інтарэсаў дзвюх краін, — суверэнітэт, тэрытарыяльная цэласнасць, бяспека, эканамічнае развіццё.

Дарэчы, у Дырэктыве адзначана, што супрацоўніцтва з КНР ажыццяўляецца на прынцыпах, сярод якіх — раўнапраўе, узаемная выгада, цеснае ўзаемадзеянне дзяржорганаў з кітайскім бокам.

Вызначаны і асноўныя кірункі супрацоўніцтва. Сярод іх — глыбокая інтэграцыя галін прамысловасці і прадпрыемстваў, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, навука і даследаванні, узаемадзеянне рэгіёнаў і іншыя.

Стратэгічны напрамак супрацоўніцтва з КНР — сумеснае развіццё ў гандлёвай, інвестыцыйнай, фінансавай і інавацыйнай сферах, а таксама стварэнне і рэалізацыя сумесных праектаў і прадпрыемстваў.

Асобным органам даручана правядзенне канкрэтных мерапрыемстваў для рэалізацыі прапісаных мэт і задач. Таксама канкрэтныя крокі прапісаны для інвестыцыйнай, фінансавай, гуманітарнай сфер, у галіне навукі і тэхнікі, рэгіянальнага супрацоўніцтва. Безумоўна, асаблівае месца ў дакументе займае Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень» як найважнейшы элемент удзелу нашай краіны ў будаўніцтве Эканамічнага пояса Шаўковага шляху.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Кампетэнтны каментарый

Спяшаемся не спяшаючыся

З 2013 года працуе сайт **codeclubworld.org** (займаюцца ім тыя ж брытанцы), задача якога — каардынаваць навучанне праграмаванню па ўсім свеце і даць магчымасць кожнаму дзіцяці атрымаць веды аб асновах інфарматыкі. Валанцёрамі з усяго свету ўжо створаны тысячы розных праектаў па розных тэмах і на розны ўзрост. Яны бясплатныя і адкрытыя для ўсіх. Гэта дэталёвыя пакрокавыя інструкцыі, якія дзеці выкарыстоўваюць для стварэння сваіх уласных гульняў, анімацый і вэб-сайтаў з такімі мовамі праграмавання, як Scratch, HTML/CSS і Python. Праекты дазваляюць пачаткоўцам паступова нарошчваць свае веды. Пры гэтым дарослым, якія кіруюць клубамі, зусім не абавязкова быць дасведчанымі спецыялістамі ў праграмаванні.

Кожны ахвотны, хто хоча заснаваць свой клуб, можа прайсці курс падрыхтоўкі на гэтым сайце і атрымаць там гатовыя інструкцыі і матэрыялы для правядзення заняткаў. Для стварэння Code Club патрабуюцца валанцёр (гэта можа быць не толькі педагог, але і хтосьці з бацькоў, студэнт-старшакурснік ці IT-спецыяліст), пляцоўка, ну і, канешне, навучэнцы, якіх трэба захапіць праграмаваннем. У групах можа быць да 15 дзяцей. Заняткі праводзяцца пасля ўрокаў ці ў выхадныя дні. Галоўны прынцып — іх бясплатнасць. Гэта робіць вывучэнне праграмавання даступным для ўсіх незалежна ад месца пражывання і сацыяльнага статусу. Выглядае ўсё прыкладна так: раз на тыдзень валанцёры прыходзяць у школу ці, напрыклад, у бібліятэку або ўстанову дадатковай адукацыі і праводзяць там занятак працягласцю ў адну гадзіну.

Ва Украіне, дзе за чатыры апошнія гады адкрылася больш як 500 код-клубаў, у якасці пляцовак для іх дзейнасці вельмі актыўна выкарыстоўваюцца менавіта бібліятэкі, а ноўтбукі дзеці прыносяць з сабой. Бібліятэкі зацікаўлены ў трафіку дзяцей, бацькоў, прыцягненні ўвагі да сябе і менш патрабавальныя да наяўнасці нейкіх афіцыйных папер. Між іншым, у нашых суседзяў нават дзейнічае нацыянальны штаб, які каардынуе дзейнасць Code Club у краіне. У ім працуе 15 чалавек, работу якіх аплачвае адзін з камерцыйных банкаў.

Ранняя прафарыентацыя

Святлана ШНЕЙДЗЕР, настаўніца фізікі, намеснік дырэктара па метадычнай рабоце Радашковіцкай сярэдняй школы, пазнаёмілася з мовай праграмавання Scratch на курсах, арганізаваных для педагогаў ПВТ, атрымала сертыфікат аб іх заканчэнні і арганізавала факультатыў для малодшых школьнікаў.

— Але мне заўсёды хацелася чагосьці менш фармальнага, таму, калі даведалася пра Code Club, адразу загарэлася гэтай ідэяй, — канстатуе педагог. — Заўважу, што школа ў нас немаленькая — каля 650 навучэнцаў, — і мы ўдзельнічаем у рэспубліканскім інавацыйным праекце па ўкараненні кампетэнтнасна-арыентаванай лічбавай мадэлі прафарыентацыйнай работы. А чаму б Code Club не разглядаць як спосаб прафарыентацыі школьнікаў? Нашы заняткі дапамагаюць фарміраваць у дзяцей інжынернае мысленне ў раннім узросце. З ведамі, якія яны тут атрымаюць, ім прасцей будзе зарыентавацца з выбарам профілю ў старшай школе і далей з выбарам спецыяльнасці. Пакуль што толькі прыкладна кожны пяты вучань 10 класаў выбірае фізіку і матэматыку ў якасці профільных прадметаў, а хацелася б, каб такіх вучняў было значна больш.

Сёння наш клуб — гэта два педагогі-валанцёры і дзве групы з 30 вучняў (трэцякласнікі і чацвёртакласнікі), якія распачалі вывучэнне праграмавання з візуальнай мовы Scratch. Праз год-два найбольш зацікаўленыя вучні змогуць перайсці на наступную прыступку ў межах клуба. Маю ініцыятыву ахвотна падтрымаў **настаўнік інфарматыкі і працоўнага навучання нашай школы Павел ЯНЧАЎСКАС.** Калі падрастуць вучні, якія маюць цікавасць да тэхнікі і базавае ўяўленне пра алгарытмы, Павел Пятровіч плануе займацца з імі канструяваннем на платформе Arduino.

— Адкрыўшы Code Club, мы вырашаем не толькі задачу засваення дзецьмі ключавых канцэпцый праграмавання, але і ствараем адукацыйнае асяроддзе, якое дапамагае дзіцяці зразумець, што для яго найбольш цікавае: пісаць код для лагічнай задачы, ствараць гульні або займацца дызайнам у анімацыі, — тлумачыць Святлана Шнейдзер. — Выконваючы праекты ў нашым клубе, дзеці развіваюць навыкі праграмавання, атрымліваюць вопыт сумеснай працы, творчага і аналітычнага мыслення. Я бачу яшчэ адзін вялікі плюс: мы можам рухацца наперад у рэалізацыі праекта ў сваім тэмпе. У нас няма абавязковай праграмы — толькі кірунак, у якім мы працуем, і гатовыя модулі з заданнямі. Заўсёды ёсць магчымасць спыніцца і разабраць складанае заданне больш дэталёва.

Канешне, стварэнню Code Club папярэднічала тлумачальная праца з бацькамі: наведваць яго можна толькі з іх пісьмовага дазволу. Добраахвотнасць — гэта другі базавы прынцып. На вялікім бацькоўскім сходзе таты і мамы азнаёміліся з дзейнасцю падобных клубаў, і групы сфарміраваліся хутка. Попыт зараз перавышае магчымасці.

У Радашковіцкай сярэдняй школе заняткі праходзяць у кабінеце інфарматыкі і ў лінгафонным кабінеце. У клубе навучэнцы выкарыстоўваюць інструкцыі па выкананні праектаў, якія ўтрымліваюць пэўны выклік: ім прапануецца стварыць, напрыклад, уласную гульню па маляванні ці навучыць рухацца касмічны карабель... А настаўнік-валанцёр выконвае ролю арганізатара і кансультанта.

Вучоба ў клубе — гэта падрыхтоўка праектаў па гатовых інструкцыях. Ёсць адзін нюанс — усе інструкцыі размяшчаюцца на сайце **codeclubworld.org** на англійскай мове, і іх даводзіцца перакладаць. У Радашковіцкай школе вырашылі прыцягнуць да перакладу старшакласнікаў — вучняў з паглыбленым вывучэннем замежнай мовы ці з педкласа. Для іх гэта выдатная практыка, а для навучэнцаў Code Club — рэальная карысць. Перакладзеныя інструкцыі размяшчаюцца ў раздзеле Code Club на сайце навучальнай установы, і кожны, хто задумаўся пра стварэнне ўласнага клуба, можа імі скарыстацца.

Як далучыцца да супольнасці?

— У адрозненне ад факультатыва па Scratch, які я вяла, Code Club дае свабоду і мне, і дзецям, — падтрымлівае калегу **настаўніца нямецкай мовы з 24-й барысаўскай сярэдняй школы Кацярына ЗАНІМОНСКАЯ,** яшчэ адзін педагог-валанцёр. — На базе нашай навучальнай установы дзейнічае STEM-цэнтр, там ёсць 10 новых ноўтбукаў, якімі мы і скарысталіся. Пагадзіцеся, што дзеці праводзяць за камп'ютарам значную частку свайго часу. Дык чаму б нам не зрабіць гэты іх спосаб баўлення часу максімальна карысным? Першыя заняткі ў Code Club адбыліся 2 лютага. Затым я разам з камандай педагогаў нашай школы ўдзельнічала ў хакатоне, таму заняткі для вучняў 3—4 класаў праводзілі валанцёры з ліку навучэнцаў нашага школьнага STEM-цэнтра.

Атрыманыя веды і вопыт удзелу ў розных конкурсах і хакатонах дазваляе дзецям не толькі вучыцца самім, але і навучаць іншых. І валанцёрам, і выхаванцам Code Club такое ўзаемадзеянне спадабалася, усім было цікава. І з задачамі справіліся, і праекты атрымаліся... Вось вам і першы ўдалы вопыт прафарыентацыі! Педагогі ўпэўнены: старшакласнікі і бацькі школьнікаў — гэта рэзерв, які абавязкова трэба мець на ўвазе. Увогуле, пры стварэнні код-клубаў варта арыентавацца ў большай ступені на бацькоў, бо не ўсе дзеці ў дзевяць гадоў маюць уяўленне аб праграмаванні.

Паводле апошняй інфармацыі, на сайце сусветнага руху Code Club зарэгістраваліся ўжо 26 клубаў з Беларусі. А Святлана Шнейдзер запусціла кампанію на платформе MolaMola па зборы сродкаў на падтрымку дзейнасці іх клуба ў Радашковічах (https://molamola.by/campaigns/437).

— Для заняткаў патрабуюцца каляровая раздрукоўка інструкцый па выкананні праектаў, папяровыя блокі праграмы Scratch для бескамп'ютарнага навучання, мікракамп'ютары, прызы для заахвочвання ўдзельнікаў клуба, — тлумачыць яна. — Усе сабраныя сродкі пойдуць на набыццё каляровых шматфункцыянальных прылад, паперы, плат micro:bit. Таксама мы будзем рады і новым валанцёрам у нашым клубе.

— Для запуску Code Club не патрабуецца папярэдні вопыт праграмавання або спецыяльнае абсталяванне, — падкрэслівае Алена Мельчанка. — Каб далучыцца да супольнасці, зусім не абавязкова быць экспертам па кадзіраванні. Можна дапамагчы перакладаць матэрыялы, каб ахапіць дзяцей па ўсім свеце, ахвяраваць сродкі або даць пляцоўку для бясплатных заняткаў. Пасля рэгістрацыі Code Club на сайце сусветнага руху codeclubworld.org валанцёр атрымлівае доступ да праектаў і мноства дадатковых карысных рэсурсаў, сертыфікатаў і плакатаў, якія можна раздрукаваць.

Дабрачынны фонд Raspberry Pi Foundation, які каардынуе сусветны рух, падтрымлівае клубы і валанцёраў з дапамогай анлайн-трэнінгаў, вэбінараў і грамадскіх мерапрыемстваў, рэгулярна праводзіць конкурсы і розыгрышы прызоў. Усё гэта робіцца для таго, каб клубы былі звязаны паміж сабой. На карце можна знайсці Code Club побач з вамі, звязацца з ім і падзяліцца сваімі напрацоўкамі і досведам. Натхненне ў такой справе вельмі важнае. А хто можа натхніць лепш, чым твае адзінадумцы?

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота атрымана ад Code Club Радашковіцкай сярэдняй школы.

Code Club стварае адукацыйнае асяроддзе, якое дапамагае дзіцяці зразумець, што для яго найбольш цікавае: пісаць код для лагічнай задачы, ствараць гульні або займацца дызайнам у анімацыі.

Краіна здароўя

Скажыце, доктар...

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Ці трэба лячыць алергію?

Май звычайна выпрабоўвае нас не толькі доўгімі святамі: на яго прыпадае пік абвастрэння сезоннай алергіі. Як перажыць гэты перыяд тым, хто на яе пакутуе, расказалі спецыялісты.

— З пацыентамі, якія маюць алергію, мы працуем круглы год. Але вясной зваротаў крыху больш, — расказвае **дацэнт кафедры геранталогіі і герыятрыі з курсам алергалогіі і прафпаталогій Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Таццяна БАРАНОЎСКАЯ.** — Колькасць выпадкаў алергіі ў свеце расце. Лічыцца, што чым лепш нам жывецца, тым больш алергічных хвароб.

Галоўнай прыкметай алергіі з'яўляецца не тое, як яна праяўляецца, а тое, на што рэагуе арганізм. Прычына заўсёды знешняя, і алергія хутка знікае, калі сыходзіць яе крыніца.

— Наш арганізм аднолькава хваравіта рэагуе ў розных абставінах: пасля ўкусу камара, алергіі на кошку і праз унутраныя прычыны. Але сімптом яшчэ не азначае дыягназ. Абавязкова павінна быць звязка: нешта побач — нам дрэнна, няма гэтай крыніцы — добра, — тлумачыць спецыяліст.

У беларусаў алергія найчасцей праяўляецца з боку органаў дыхання — рынітам ці бранхіяльнай астмай. Крыніцай пераважна служаць квітнеючыя расліны, поўсць хатніх жывёл, кляшчы і хатні пыл.

— Алергік звычайна добра ведае прычыну сваёй немачы. Калі гэта трава, то алергія наступае строга па сезоне, калі поўсць жывёл, то ў той час, калі кошка побач, калі кляшчы, то ад старых рэчаў у старых дамах.

Трэба памятаць, што алергія — гэта невылечная хвароба. Але кантраляваць яе можна, што дазваляе паўнацэнна жыць.

— Для таго каб прымірыць чалавека з алергенам, мы карыстаемся ўсімі сучаснымі метадамі. І лячыць алергію варта. Здараецца, што дзеці вырастаюць з насмаркам і не звяртаюць на яго ўвагу, быццам так і трэба. Калі не лячыць алергію ў лёгкай форме, ёсць небяспека таго, што надыдзе другая, больш цяжкая яе хваля, — падкрэсліла Таццяна Бараноўская.

Сёння малекулярная алергалогія дазваляе больш дакладна вызначаць розныя віды алергенаў, а алергенспецыфічная імунатэрапія — калі невялікая доза алергену ўводзіцца пацыенту для таго, каб арганізм перастаў на яго рэагаваць, — дазваляе на некалькі гадоў забыць пра сваю немач.

Як адзначыў **загадчык алергічнага аддзялення 4-й дзіцячай клінічнай бальніцы г. Мінска Дзмітрый БУЗА,** у дзіцячай алергалогіі сітуацыя не такая светлая, як у дарослай. Каля 20 % дзяцей першага году жыцця маюць скурныя праблемы, больш вядомыя як дыятэз. Гэта першы крок да атапічнага дэрматыту, самага распаўсюджанага алергічнага захворвання дзяцей да трох гадоў. З часам атапічны дэрматыт пераходзіць у іншую форму, якая праяўляецца на органах дыхання, — дэбют здараецца, як правіла, у 5—7 гадоў. Алергічныя захворванні органаў дыхання (ад рыніту да бранхіяльнай астмы) — самыя распаўсюджаныя ў падлеткавай групе. У Беларусі 21 тысяча дзяцей, якія пакутуюць на бранхіяльную астму.

Для аблягчэння сімптомаў пры розных формах гэтай хваробы выкарыстоўваюцца розныя метады. З лёгкімі праявамі дастаткова карыстацца балончыкам 1-2 разы на месяц, але ёсць і цяжкія формы, пры якіх прэпараты патрэбны штодзень.

Алергія на лекі сустракаецца вельмі рэдка, адзначыла Таццяна Бараноўская. Але калі яна ў вас ёсць, абавязкова папярэджвайце ўрача пра такія праявы. Яшчэ адна разнавіднасць — холадавая алергія, калі адкрытыя ўчасткі скуры на холадзе пачынаюць свярбець. Пры сагравanні гэты эфект праходзіць. Калі ж на холадзе сухая скура пашкоджваецца і пачынае лушчыцца, гэта не сапраўдная алергія, а пашкоджанне скуры холадам.

— Сёння шмат лабараторый прапануюць тэсты на алергію, але пытанне аб іх мэтазгоднасці вырашае толькі ўрач, — адзначыла спецыяліст. — Самадыягностыка ў такіх выпадках — дарэмная трата грошай і часу.

ЛЕТНЯЯ НЕЧАКАНАСЦЬ

Кішачныя інфекцыі: што выклікае атручванне і як яго лячыць

Сарваная з дачнага куста і адпраўленая проста ў рот клубніца або шашлык, які мы ўзялі нямытымі рукамі, — гэта і многае іншае можа прымусіць нас літаральна праз гадзіну-другую забыць пра задавальненне летняга адпачынку і адправіцца ў ложак. Летам, калі мы робімся больш актыўнымі, узрастае і колькасць атручванняў.

Традыцыйна рост колькасці кішачных інфекцый пачынаецца з мая і заканчваецца ўвосень.

— Гэта звязана з павелічэннем актыўнасці — людзі выязджаюць на прыроду, адпачываюць на адкрытым паветры, праводзяць святочныя мерапрыемствы і выкарыстоўваюць розныя прадукты, якія могуць быць крыніцай хваробы, — кажа **загадчык супрацьэпідэмічнага аддзялення Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Дзмітрый ГАЛОЦІК.** — Пакуль сітуацыя з кішачнымі інфекцыямі кантралюемая і стабільная. Узровень захваральнасці ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года скарацiўся на 21 %, а па некаторых вострых кішачных інфекцыях устаноўленай этыялогіі — на 26 %.

У нашай краіне традыцыйна лідыруюць вострыя кішачныя інфекцыі, выкліканыя вірусамі. Сёлета іх колькасць таксама знізілася, у прыватнасці па ротавірусах — на 40 %, энтэравірусах — на 50 %.

— Аднак зніжэнне захваральнасці не гарантуе, што не адбудзецца ўспышкі інфекцыі. Харчовыя атручванні нас падпільноўваюць пры любым парушэнні правілаў гігіены і бяспекі захоўвання і прыгатавання прадуктаў. Узбуджальнікі кішачных інфекцый перадаюцца праз ваду, ежу, брудныя рукі, — папярэджвае Дзмітрый Галоцік. — Летам здараюцца выпадкі так званых «вясельных інфекцый», калі гатуюцца салаты, асабліва з маянэзам, на вялікую колькасць гасцей, яны захоўваюцца некалькі гадзін, прычым побач з гарачымі плітамі, дзе гатуюцца астатнія стравы, і робяцца крыніцай успышак атручванняў.

ПРАВІЛЫ БЯСПЕКІ

Гэтыя простыя правілы варта памятаць і выконваць кожнаму.

Не набывайце ежу сумнеўнага паходжання — тую, што прадаецца ў неўстаноўленых месцах (каля ўваходаў у метро і прыпынкаў грамадскага транспарту), якая не мае звестак аб тэрмінах прыдатнасці і ўмовах захавання. Зараз часам «з глебы» прадаюцца нават мяса і паўфабрыкаты, якія ў цёплую пару года павінны захоўвацца ва ўмовах ахалоджання ці замарозкі.

Падтрымлівайце чысціню ў месцах захоўвання, гатавання і ўжывання ежы. Аддзяляйце сырыя прадукты ад прыгатаваных падчас дастаўкі, гатавання і захоўвання.

Прытрымлівайцеся тэхналогіі прыгатавання страў. Прадукты неабходна абавязкова прасмажваць на ўсю глыбіню, пры гэтым наразаць іх варта невялікімі кавалкамі. Стравы, якія захоўваюцца доўга, варта падагравaць, суп даводзіць да кіпення. Пры прыгатаванні мяса важна сачыць за мясным сокам — ён павінен змяніць свой колер. Памятайце, што, ужываючы мяса з крывёю, вы рызыкуеце. Есці яго можна толькі ў тых установах, дзе наладжаны пільны вытворчы кантроль. Прытрымлівайцеся тэрмінаў прыдатнасці прадуктаў: выкінуць такую ежу атрымаецца танней, чым пасля лячыць атручванне. Летам захоўвайце прадукты ў халадзільніку, лепш адразу паставіць туды і прыгатаваныя стравы. Пры хатняй тэмпературы іх рэкамендуецца захоўваць не больш за гадзіну-дзве.

Выконвайце правілы асабістай гігіены. Мыйце рукі перад прыняццем ежы ў любых сітуацыях: калі побач няма чыстай вады, карыстайцеся антысептыкам ці вільготнымі сурвэткамі. Пры выездзе на вадаём бярыце з сабой запас пітной вады, каб была магчымасць памыць прадукты і прытрымлівацца правілаў гігіены.

ПРЫ ВЫЕЗДЗЕ ЗА МЯЖУ

Медыкі папярэджваюць, што з тымі хваробамі, якіх у нас няма, можна сустрэцца за мяжой — у краінах Азіі, Турцыі, Егіпце і нават Еўропе. Гепатыт А, брушны тыф, халера могуць быць шырока распаўсюджаны ў тым рэгіёне, куды вы накіроўваецеся.

Таму асабліва важна не ўжываць сырыя прадукты, у прыватнасці мяса, не піць ваду з невядомых крыніц, не купацца ў неўстаноўленых месцах, не ўжываць морапрадукты, прыгатаваныя ў сумнеўных умовах. Апошнія, дарэчы, могуць здабывацца ў прыбярэжнай зоне, куды скідваюцца сцёкі, і назапашваць шкодныя рэчывы.

БЕЗУПЫННАЕ РАССТРОЙСТВА

Калі ж шкодны мікраарганізм усё ж трапіў да вас, як правіла, праз 6—12 гадзін ён нагадае пра сябе. Але пры некаторых інфекцыях, у прыватнасці гепатыце А, інкубацыйны перыяд можа дасягаць 35 сутак.

— Інкубацыйны перыяд складае ад паўгадзіны да трох сутак. Чым ён карацейшы, тым большую дозу інфекцыі вы атрымалі і тым больш патагенныя мікраарганізмы, — кажа **намеснік галоўнага ўрача Гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы г. Мінска Святаслаў ВЕЛЬГІН.**

Кішачныя інфекцыі небяспечныя найперш стратай вадкасці і электралітаў, якія арганізм губляе падчас дыярэі і рвоты. Разам з тым ён губляе запасы натрыю і хлору. А гэта, у сваю чаргу, вядзе да аслаблення арганізма, зніжэння артэрыяльнага ціску, страты прытомнасці.

— Таму пры кішачных інфекцыях важна захоўваць пітны рэжым. Прычым піць не проста ваду — ёсць сродкі для аральнай дэгідратацыі. Гэта сумесі пад рознымі гандлёвымі назвамі, якія ўтрымліваюць неабходныя для арганізма соль, цукар. Іх разводзяць у кіпячонай вадзе і ўжываюць да 1,5 літра ў суткі. Калі стан не дазваляе піць, трэба звяртацца да ўрача, які прызначыць увядзенне солевых растворaў парэнтэральна. Асабліва небяспечна абязводжванне ў дзяцей, таму іх, як правіла, шпіталізуюць, — папярэджвае Святаслаў Вельгін.

Яшчэ адна праблема пры кішачных інфекцыях — інтаксікацыя. Мікраарганізмы выдзяляюць таксіны, якія вядуць да павышэння тэмпературы цела, галаўнога болю і іншых непрыемных сімптомаў. Змагацца з гэтым можна энтэрасарбентамі, самы просты з якіх — усім вядомы актываваны вугаль. Яны ліквідуюць прадукты жыццядзейнасці шкодных мікробаў і аблягчаюць стан.

АНТЫБІЁТЫКІ ПАЧАКАЮЦЬ

Антыбіётыкі медыкі не раяць прымаць пры кішачных інфекцыях, акрамя тых выпадкаў, калі вы знаходзіцеся за мяжой і медыцынская дапамога недаступная.

— Рэцэптурны антыбіётык — цыклафлаксацын можа прымяняцца, калі на адпачынку здарылася дыярэя. Больш даступны і бяспечны прэпарат — нітафураксазід. Гэта кішачны антысептык, які дазваляе кантраляваць інфекцыю на ўзроўні кішэчніка, — тлумачыць Святаслаў Вельгін.

Вельмі важна падчас кішачнай інфекцыі прытрымлівацца дыеты. Ёсць шэраг прадуктаў, якія арганізму цяжка ператравіць, калі парушана стравальная функцыя. Гэта малако, свежыя гародніна і фрукты, вострая і смажаная ежа. Мяса пажадана ўжываць у гэты час у выглядзе паравых катлет.

Стравaванню можна дапамагчы ферментамі, гэта паскорыць выздараўленне. Яшчэ адзін кірунак лячэння — нармалізацыя мікрафлоры страўнікава-кішачнага тракту. Для яе аднаўлення таксама існуе шэраг прэпаратаў.



Дзеці вайны

ЯК ГЭТА ЦУДОЎНА — ЖЫЦЬ!

Гісторыя маленькай вязніцы

— Ах ты шкода гэтакая! Ідзі адгэтуль, ідзі!

Трохгадовая дзяўчынка насупілася, паглядзела на маму і пабегла за печку. Там яна гучна заплакала. За печкай жылі кацяняты. Яны ўжо падраслі, і з імі можна было гуляць. На гэты раз Поля прыбегла да пухнатых сяброў падзяліцца сваім горам: мама незадаволена! Яна прыціскала кацянят да мокрага ад слёз твару і паўтарала: «Кацяняткі вы мае, кацяняткі», — а потым зноў пачынала раўці ад жалю да сябе.

Гэту гісторыю 80-гадовая Паліна Гендзік пачула ад сваёй маці. Некалі яна расказвала яе дачцэ і ўсміхалася. Цяпер Паліна Аляксандраўна дзеліцца ёю з намі. Паліна Аляксандраўна жыве ў горадзе Сянно ўжо шмат гадоў. Тут яна выйшла замуж і нарадзіла дачку, тут адпрацавала ўсё жыццё ўрачом і выйшла на пенсію... У дзіцячым узросце Паліна стала вязнем канцлагера. Доўгі час у яе не было магчымасці расказаць пра гэту частку свайго жыцця...

Жанчына стала хадзіць па дамах, шукаць прытулак. Але такіх, як яна, была не адна сотня. Таму часта начавалі на паддашку сярод бруду і ануч. Харчаваліся тым, што давалі людзі. Было, што на іх спускалі сабак.

— Мы доўга маўчалі, бо лічылася, што вязні — здраднікі, — спакойна і без крыўды расказвае Паліна Аляксандраўна. — Я нават не распытвала маму, бо нутром адчувала — нельга. Вязнямі была амаль уся мая сям'я: тата, маці і я з братам.

Сітуацыя змянілася ў 90-х. З таго часу Паліна Аляксандраўна не хавае сваю гісторыю, бо ўпэўнена: калі людзі ўсвядомяць, што адбывалася ў тыя часы, то змогуць зразумець, што жыццё — гэта цуд...

Яна добра памятае той летні дзень. За акном сталі чутныя роў матацыклаў і нямецкая гаворка. Дома былі ўсе: тата, якога накіравалі з фронту дамоў на лячэнне, мама і старэйшы шасцігадовы брат Валодзя. Раптам у хату ўварваліся людзі ў зялёнай форме і сталі выштурхваць іх з дому. Маці падхапіла малую на рукі.

— Я адчувала страх ва ўсім целе, — успамінае Паліна Аляксандраўна. — Здавалася, страх быў паўсюль: у доме, на вуліцы, у паветры. Людзі не разумелі, што адбываецца.

Напэўна, гэта была нейкая карная аперацыя, бо ноччу ў вёску часта наведваліся партызаны... Старых загналі ў хлеў і падпалілі. Людзі плакалі.

— Наш дом таксама падпалілі. Я глядзела, як ён гарыць... Было невыносна горача... Я не памятаю твары гэтых людзей, толькі іх боты, зялёную форму і матацыклы, — Паліна Аляксандраўна адварочваецца ад нас, каб набраць паветра і супакоіць дрыжачы голас.

Да нашага прыезду жанчына рыхтавалася. У маленькай кухні светла. Час ад часу гучна працуе халадзільнік. Стол, за якім мы сядзім, стаіць якраз каля акна, праз якое ярка свеціць сонца. Вясна. Ледзь чутна шчабятанне птушак.

— Вось яшчэ ўнучка мне цукеркі прывезла... Частуйцеся. Ведаеце, я так добра ніколі не жыла, як цяпер...

У той дзень есці ёй не хацелася. Людзей гналі па дарозе пешшу да чыгуначнай станцыі ў Верхнядзвінску. Ішлі жанчыны, мужчыны, дзеці... Ішлі моўчкі. На станцыі Полю з сям'ёй загналі ў вагон для перавозкі скаціны. Як толькі дзверы зачыніліся, стала цёмна. Людзі пачалі гучна плакаць. А маленькая Паліна глядзела на святло, якое прабівалася скрозь вентыляцыйны люк.

— Там было невыносна цесна і душна. Мы стаялі вельмі шчыльна адно да аднаго. У роце было суха — вельмі хацелася вады... Я не памятаю, як нас прывезлі ў рыжскі лагер Саласпілс. Але памятаю, што маму пастрыглі. Абдалі са шланга халоднай вадой і далі надзець паласатую кашулю.

Поля плакала і крычала. Яе з братам адарвалі ад маці і пагналі з іншымі дзецьмі ў асобны барак. Там былі трохпавярховыя драўляныя нары, на якіх ляжалі салома і нейкія анучы. Шасцігадовы Валодзя палажыў Полю на нары. Яна дрыжала. Ён гладзіў і абдымаў маленькую сястрычку, нешта шаптаў ёй, спрабуючы супакоіць. Хутка да іх падышоў і стрыечны брат Федзя. Ён таксама стаў супакойваць Полю. Але хто б ведаў, як страшна гэтым хлопчыкам было самім...

— Дарослых у лагеры накіроўвалі працаваць на чыгуначную дарогу. А з нас, дзяцей, выпампоўвалі кроў для салдат, ставілі нейкія эксперыменты. Разумееце, я пражыла 80 гадоў і ўсё ніяк не магу гэта ўсвядоміць, забыць...

Маленькая Паліна слабела на вачах. Яна не заўсёды нават магла есці, і кармілі дрэнна: нейкім незразумелым варывам, у якім поўзалі чарвякі.

Здавалася, хіба можа быць нешта горшым для дзяўчынкі? Аказалася, можа. У адзін з такіх дзён роднага брата малой некуды забралі.

— Больш моцных дзетак немцы сталі аддаваць на ўсынаўленне. І майго брата вырашыла забраць нямецкая сям'я. У іх не было сына. Валодзя ім расказаў, што ў яго засталіся родныя ў лагеры. Гэта былі добрыя людзі. Яны прыйшлі да маці прасіць у яе дазволу, каб забраць Валодзю. Маці не згаджалася. Але якія ў вязня маглі быць правы? З іншага боку, гэта быў шанец выжыць хоць бы для Валодзі.

Калі немцы сталі адступаць, тая сям'я вярнула Валодзю бацькам. Аднак усіх вязняў з лагера не адпусцілі, а павезлі ў Аўстрыю, у іншы лагер Бешасафіт. Там сям'я Гендзікаў пакутавала яшчэ два гады.

Маленькая Поля ўспамінала, як апрытомнела ў нейкай лякарні. Яна расплюшчыла вочы і ўбачыла, што ляжыць у невялікім, агароджаным борцікамі ложку. Поля паспрабавала ўстаць... але не змагла. У палату ўвайшла прыгожая жанчына ў чорнай сукенцы з белым фартухам і ў галаўным уборы, які звычайна носяць каталіцкія манашкі. Яна паставіла невялікі ўслончык з талерачкай на ложак і стала карміць малую.

— Мяне даволі доўга так даглядалі, — успамінае Паліна Аляксандраўна. — Клопат гэтых жанчын паставіў мяне на ногі. Неўзабаве я быццам ажыла, і мяне накіравалі ў іншую палату, дзе ўжо жылі нейкія дзеці.

Потым па яе прыйшла мама. Гэта быў месяц май, прырода прачыналася і давала надзею на лепшае жыццё. Ішоў 1945 год, калі Паліна з маці выйшлі за вароты канцлагера. Але куды ісці ў чужой краіне? Жанчына стала хадзіць па дамах, шукаць прытулак. Але такіх, як яна, была не адна сотня. Таму часта начавалі на паддашку сярод бруду і ануч. Харчаваліся тым, што давалі людзі. Было, што на іх спускалі сабак. Так яны пражылі некалькі месяцаў. Толькі ў жніўні быў арганізаваны пераезд вязняў назад, на радзіму.

— Якое гэта было шчасце! — усхвалявана гаворыць Паліна Аляксандраўна. — Гэта быў кароткі перыяд, калі наша сям'я ўз'ядналася, мы знайшлі адно аднаго. Разам, мама, тата, я, Валодзя селі на параход і накіраваліся дадому. З намі плылі і савецкія салдаты. Яны падарылі Валодзю мандаліну. Гэта была наша сямейная рэліквія. Не толькі брат, але і я навучыліся на ёй іграць.

Сям'ю Гендзікаў прывезлі ў Рыгу. Але... там іх зноў разлучылі. Бацьку адразу забралі і накіравалі аднаўляць завод у Адэсу, а маці засталася адна з двума дзецьмі на руках. Жанчына ўспомніла, што на мяжы з Беларуссю ў іх жывуць сваякі, і накіравалася туды. Іх прынялі. Накармілі. Але ноччу на хутар напалі. Уварваліся нейкія людзі і сталі збіваць гаспадароў за тое, што прытулілі «чужакоў». Раніцай сям'я Гендзікаў накіравалася ў бок Беларусі. Ужо на радзіме стала ўсё больш-менш наладжвацца. Пасяліліся ў сваякоў. Паліна з братам пайшлі ў школу. Маці цяжка працавала, каб пракарміць сям'ю. Былі і шчаслівыя моманты ў маленькай Полі нават у тыя складаныя часы.

— Я памятаю, як бацька вярнуўся дамоў. Радасць цераз край, слёзы мамы... І мы ўсе цалуем адно аднаго, абдымаемся, — Паліна Аляксандраўна ўсміхаецца.— А потым — нараджэнне сястрычкі, новы дом і маё першае каханне...

Яна з трапятаннем перабірае старыя фотаздымкі і пажоўклую паперу, на якіх напісаны вершы, прысвечаныя ёй.

— Кожны дзень — каштоўны,— гаворыць на развітанне Паліна Аляксандраўна. — Кожны дзень! Шчасце, што мне ўдалося даведацца, як гэта цудоўна — жыць!

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

ЗНАХОДКА З АСАБІСТЫМ НУМАРАМ

Супрацоўнікі Чырвонага Крыжа знайшлі ордэн Айчыннай вайны II ступені ў рэчах гуманітарнай дапамогі.

У лістападзе на сталічных вуліцах з'явіліся кантэйнеры, у якія можна здаць непатрэбнае адзенне. Рэчы, якія сюды трапляюць, Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа сартуе і перадае тым, хто мае ў іх патрэбу. Аднак у красавіку ў рукі супрацоўнікам арганізацыі трапіла рэч, якую наўрад ці нехта асмеліцца прымераць, — ордэн Айчыннай вайны II ступені.

— Дагэтуль знаходзілі ў адзенні рознае. Народ перад тым, як несці рэчы ў кантэйнер, не заўсёды іх праглядвае. Вось і трапляюць да нас старыя кашалькі, правы кіроўцы і нават банкаўскія карткі. Праўда, усё адзенне ў самым пачатку пасля сартавання адпраўляецца на дэзынфекцыю. Яго адпарваюць пад тэмпературай 300 градусаў. Ад паперы і пластыку пасля такога ўздзеяння нічога не застаецца. Таму не варта забываць асабістыя рэчы ў кішэнях, — расказвае **Андрэй БАГДАНАЎ, галоўны спецыяліст Мінскай гарадской арганізацыі Чырвонага Крыжа.** — Ордэн мы знайшлі не ў самім адзенні, а ў скрыні, дзе яно было. Як ён туды трапіў — таямніца. Хутчэй за ўсё, нехта паклаў разам з рэчамі, а ён выкаціўся. Цікава, што на адваротным баку ордэна шмат сажы, быццам ён пабываў на пажары.

Паколькі ўзнагарода нумарная, супрацоўнікі Чырвонага Крыжа ўзяліся за пошукі ўладальніка. Спачатку дасылалі запыты ў беларускія архівы, пасля ў Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, дзе захоўваецца інфармацыя савецкіх часоў.

Андрэй БАГДАНАЎ спачатку знайшоў узнагароду ветэрана, а цяпер шукае сваякоў удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

— Аказалася, што належаў ордэн **Іосіфу Ільічу МЕЛЯШЧЭНЮ 1922 года нараджэння.** Ён нарадзіўся і жыў у вёсцы Знаменка Жыткавіцкага раёна. Запыт на пошук сваякоў мы адправілі ў МУС. Працэдура не хуткая, таму пакуль чакаем адказ, — падзяліўся **спецыяліст Чырвонага Крыжа па пошукавай дзейнасці Ідаэль ГЕРЭРА.** — Увогуле, наша арганізацыя даволі актыўна працуе ў сферы пошукаў загінулых падчас Вялікай Айчыннай вайны. Пачынаючы з 1995 года да нас паступіла каля 30 тысяч запытаў на пошукі, прыкладна палова спраў была закрыта з паспяховым вынікам.

Пакуль праваахоўныя органы займаюцца пошукамі сваякоў уладальніка ордэна, Андрэй Багданаў правёў сваё невялічкае «расследаванне».

— Патэлефанаваў знаёмым з Жыткавіцкага раёна. Высветлілася, што ў Знаменцы большая частка жыхароў з прозвішчам Меляшчэня. Аднак знайшліся людзі, якія памятаюць Іосіфа Ільіча і ведаюць, дзе ён пахаваны. Кажуць, што сын яго даўно з'ехаў жыць у Мінскую вобласць, але і яму зараз павінна быць за 70. Таму спадзяёмся, што ў хуткім часе ўдасца выйсці на ўнукаў і разабрацца ў сітуацыі.

Ганна КУРАК, фота аўтара.

Урок мужнасці

Медалі для праўнукаў

У атрадзе яго звалі Косцем, ці «французам». На яго раўняліся, бо бачылі, на якія дзёрзкія выхадкі ў баях гатовы пайсці гэты чалавек. Ён мог захапіць палоннага і з такой здабычай залегчы ў засаду, класці ўзрыўчатку на рэйкі, проста пад колы цягніка, калі не хапала зброі, прапанаваць здабыць яе ў ворага. Сціплы і негаваркі, Конрад Мадэй кіраваў групамі мінёраў, штурмавымі групамі, якія разграмілі не адзін варожы гарнізон, у тым ліку і ўзмоцнены нямецка-паліцэйскі гарнізон у Бялынічах. Дарэчы, тут ён захапіў нямецкую гармату і сумеў з яе адкрыць агонь па фашыстах. Не раз ён рызыкаваў жыццём, і дзіва, як яму ўдавалася выходзіць цэлым і выводзіць сваіх людзей з самых складаных сітуацый.

Калі пачалася вайна, Конрад Мадэй сам папрасіўся на фронт. Ён быў чэмпіёнам і рэкардсменам Масквы па плаванні, працаваў трэнерам у спартыўным клубе «Дынама». Таму хлопца разам з іншымі спартсменамі ў складзе атрада спецыяльнага прызначэння «Слаўны» накіравалі для правядзення дыверсійных работ на акупаваную немцамі тэрыторыю...

Сёння пра подзвігі Мадэя можна даведацца дзякуючы ўцалеламу дзённіку, які вёўся ў атрадзе ў 40-я гады. Копія гэтага дзённіка папоўніць экспазіцыю музея 45-й школы Мінска. Яе падарылі ўстанове адукацыі ветэраны арганізацыі контрразведчыкаў. Рэч у тым, што ў гэтай школе вучыліся ўнучкі адважнага партызана, а сёння там атрымліваюць веды два яго праўнукі.

Днямі прадстаўнікі Беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў КДБ «Гонар» сустрэліся з навучэнцамі школы, уручылі нашчадкам Мадэя ганаровыя медалі і дакументы, якія сведчаць пра подзвігі іх дзядулі, у тым ліку характарыстыкі, якія збіраліся, каб прысвоіць Конраду Андрэевічу званне Героя Савецкага Саюза.

Сустрэча прайшла ў межах рэспубліканскай акцыі «Беларусь памятае».

Падчас урока мужнасці ганаровыя госці расказалі дзецям пра кнігу «Астравы памяці», у якой напісана пра подзвігі Конрада Мадэя і пра адзін з самых вядомых дыверсійных атрадаў «Слаўны». Таксама ў кнізе апублікаваны ўспаміны партызанаў і разведчыкаў, эксклюзіўныя дакументы, фатаграфіі з сямейных архіваў, інфармацыя пра пошукавую работу, якую праводзіць арганізацыя ветэранаў КДБ. Там жа надрукаваны і дзённік, які вёў начальнік штаба атрада «Слаўны» Міхаіл Абаротаў. Тут падрабязна апісваюцца бавыявя сутыкненні, у якіх удзельнічаў атрад, згадваюцца імёны і месцы пахавання байцоў. Як расказаў сябра Савета ветэранскай арганізацыі ўпраўлення ваеннай контрразведкі КДБ, падпалкоўнік у адстаўцы Вячаслаў Баршчэўскі, дзякуючы запісам, зробленым у дзённіку, удалося знайсці сцёртыя вайной прозвішчы байцоў, у тым ліку і немцаў, якія перайшлі на бок партызанаў. Але вось з адным прозвішчам загінулага салдата, які згадваецца ў дзённіку, узніклі праблемы. Пошукавікі просяць адгукнуцца сваякоў ураджэнца Бялыніч Дзеравяшкіна Валянціна Іванавіча 1927 года нараджэння...

Сваякі Мадэя беражліва захоўваюць інфармацыю пра дзядулю: у вялізнай скрыні складзены старыя фатаграфіі, узнагароды, выразкі з газет. Час ад часу гэта скрыня адкрываецца, і пра гераічнага дзядулю расказваюць дзецям... Але жыве памяць пра вайну і ў іншых сем'ях навучэнцаў 45-й школы — дзеці збіраюць інфармацыю і фатаграфіі сваіх дзядоў для інфармацыйнага стэнда, прысвечанага ваенным падзеям. У школе дзейнічае шыкоўны музей, дзе гасцям, акрамя іншага, заўсёды гатовы расказаць пра газету «Звязда» і герояў-падпольшчыкаў, якія яе выдавалі ў гады вайны.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Пытальнік

«Апошні свой бой прыняў у Венгрыі...»

Як знайсці месца пахавання роднага чалавека?

«Добры дзень. Я, Агапава (Цеплякоўская) Ніна Астапаўна, ураджэнка с. Азарычы Гомельскай вобласці, з'яўляюся пляменніцай Праскоўі Іванаўны Цеплякоўскай, маці майго стрыечнага брата — сапёра, радавога 303-й стралковай Верхнедняпроўскай Чырвонасцяжнай дывізіі Цеплякоўскага Аляксандра Міхайлавіча, які прыняў апошні бой 5.12.1944 года каля хутара Радваніцкі Будапешцкай вобласці Венгрыі. Апошняе, што пра яго вядома, — пахаваны ў брацкай магіле там жа, каміт. Пешт—Піліс—Шолт—Кішкун, Асодская акр., хутар Радваніцкі, брацкая магіла 12138. Па іншых звестках, ён пахаваны ў с. Ненінцы. Прашу вас даць канкрэтныя звесткі мясцовых арганізацый для ўдакладнення абставін гібелі майго сваяка... Пакідаю кантактнай асобай свайго сына Сяргея».

Вось такі электронны ліст, які мы прыводзім амаль што даслоўна, атрымала рэдакцыя. Зыходзячы з атрыманай у ім інфармацыі, паспрабуем у меру сваёй кампетэнцыі даць адказ на яго. Зараз дзякуючы інтэрнэту пошукі патрэбных звестак спрасціліся і іх можна весці самастойна, чым, відаць, і зоймецца сын заяўніцы Сяргей.

Найперш трэба заняцца зборам звестак, якія зможаце знайсці, — удакладніце прозвішча, імя, імя па бацьку таго, каго будзеце шукаць (магчымыя памылкі ў напісанні), месца нараджэння, месца жыхарства да вайны, ваенкамат, якім салдат быў прызваны, адрас родных, партыйнасць (воінскае званне і апошняе месца службы вядомыя). Калі захаваліся пісьмы, з іх вы даведаецеся пра нумар палявой пошты. Род войскаў (сапёр), вайсковая частка (дывізія) ужо таксама вядомыя.

Далей пошукі можна пачаць з абагульненага банка даных «Мемарыял», вы Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (сайт obd-memorial.ru), у якой ёсць амаль усе воінскія пахаванні байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі. Запаўняючы адпаведныя графы ў пошукавіку, дасведчаныя людзі раяць эксперыментаваць з іх напісаннем, мяняючы літары ў імені, прозвішчы, — не ўсе пісары былі вельмі адукаваныя, а архіўны дакумент мог дрэнна захавацца. На форумах даюцца парады, што, правяраючы звесткі пра чалавека, трэба адкрыць укладку «пашыраны пошук» і рабіць спробы, набіраючы толькі прозвішча, потым прозвішча і імя, затым — поўныя даныя. Таксама можна праверыць інфармацыю, задаўшы параметр прозвішча, а імя і імя па бацьку даваць толькі ініцыяламі.

Калі гэты спосаб плёну не даў, пошукі можна прадоўжыць. У лісце гаворыцца, што салдат прыняў свой апошні бой. Быў забіты ці памёр ад ран? Калі апошняе, трэба пісьмова звярнуцца ў архіў ваенна-медыцынскіх дакументаў філіяла Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (191180, г. Санкт-Пецярбург, Лазараўскі завулак, д. 2). Такім чынам, магчыма, атрымаецца па пашпарце воінскага пахавання (калі яно было шпітальным) знайсці канкрэтную інфармацыю аб месцы апошняга прытулку байца.

Памятаеце, мы згадвалі пра інфармацыю аб ваенкамаце, якім прызываўся чалавек? У кожным раёне ёсць Кнігі памяці, дзе, не выключана, могуць быць зведскі пра баявы шлях і месца пахавання сваяка. Можна паспрабаваць накіраваць запыт і ў Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (142100, Маскоўская вобласць, г. Падольск, вуліца Кірава, д. 74). Трэба толькі памятаць, што пісьмовых адказаў давядзецца чакаць дастаткова доўга — мінімум паўгода.

Калі вярнуцца да тэмы пошукаў у інтэрнэце, дык у сецівe ёсць яшчэ іншыя рэсурсы, якія можна скарыстаць. Напрыклад, Soldat.ru — старэйшы расійскі партал па ўстанаўленні лёсаў загінулых вайскоўцаў ці тых, хто прапаў без вестак.

Яшчэ адзін варыянт — паспрабаваць звярнуцца ў консульскі аддзел пасольства краіны ў Венгрыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Праблема і рашэнне

КАБ СУСЕДСТВА БЫЛО БЯСПЕЧНЫМ

Магілёў яшчэ з савецкага часу пазіцыянаваўся як горад вялікай хіміі. І ў першую чаргу гэта было звязана з тым, што тут быў пабудаваны гігант хімічнай прамысловасці «Магілёўхімвалакно». Сёння прадпрыемства значна паменшылася ў памерах, некаторыя яго пляцоўкі наогул закрыліся, але былая прамзона ператварылася ў пляцоўку СЭЗ «Магілёў», дзе на цяперашні час дзейнічае некалькі хімічных прадпрыемстваў. Іх прысутнасць адчуваюць жыхары не толькі бліжэйшых вёсак, але нават ускраін горада. Прадпрыемствы вінавацяць не без падставы. Летась абласная пракуратура распачала крымінальную справу ў адносінах да шэрагу прадпрыемстваў СЭЗ «Магілёў» і ЖКГ Магілёўскага раёна, якіх абвінаваціла ў скідах сцёкавых вод у мясцовую рэчку Дзягцярку. Парушэнне было ліквідаванае, але горкі прысмак застаўся. А хутка на чацвёртай пляцоўцы СЭЗ запрацуе яшчэ адно прадпрыемства — «Омск Карбон Магілёў». І жыхары бліжэйшых да яго населеных пунктаў хвалююцца, наколькі бяспечным будзе гэтае суседства.

ЗАЎВАГІ ПРЫМАЮЦЦА

Летась у лістападзе на стадыі пробнага запуску «Омск Карбон Магілёў» ужо паспеў трапіць у спіс патэнцыйна небяспечных — жыхары аграгарадка Вейна паскардзіліся, што ў гэты дзень іх пасёлак накрыла сажай. Між тым прадпрыемства ўжо гатова распачаць работу на поўную магутнасць. Завод пабудаваны, у яго укладзены вялікія інвестыцыі, якія падмацавалі эканоміку вобласці. Ён збіраецца выпускаць экспартна-арыентаваную прадукцыю, на якую ёсць попыт і ў Беларусі, і за яе межамі. Але перш за ўсё трэба зрабіць, каб ад яго дзейнасці не пацярпела экалогія Магілёва. Пра гэта і ішла размова на адным з апошніх грамадскіх абмеркаванняў, дзе разглядалася ацэнка ўздзеяння прадпрыемства на навакольнае асяроддзе (АУНА). Без яе зацвярджэння прадпрыемства не мае права распачаць сваю дзейнасць. Але перад тым як трапіць на дзяржэкспертызу ў Рэспубліканскі цэнтр пры Мінпрыродзе, дакумент павінен прайсці грамадскае абмеркаванне.

Дзе і калі яно адбудзецца, можна было даведацца з сайта Магілёўскага райвыканкама. У будынку дома культуры аграгарадка Вейна сабраліся ўсе зацікаўленыя. Населены пункт знаходзіцца ўсяго за некалькі кіламетраў ад прадпрыемства, а менавіта чацвёртай пляцоўкі СЭЗ «Магілёў». Людзі вельмі заклапочаны такім суседствам, некаторыя жыхары прыйшлі нават з дзіцячымі калясками.

— Мы пераехалі сюды жыць паўтара года таму, і я вельмі хвалююся за будучыню сваіх дзяцей, — падзялілася адна з жыхарак. — Асабліва пасля таго, як убачыла тую сажу пасля пробнага запуску завода. У мяне ў зале было адчынена акно, і, калі я прыйшла з работы, цюль быў чорнага колеру. І я не змагла яго адмыць. Болей такога не здаралася, але пахі ад іншых прадпрыемстваў адчуваюцца дагэтуль. Сёння, напрыклад, быў пах гарэлых шын і смалы.

Калі завод зробіць якасныя ачышчальныя збудаванні і паставіць фільтры, якія адпавядаюць сусветным стандартам, ніхто супраць яго не будзе, — кажуць жыхары аграгарадка. Але пакуль сумняваюцца, што гэта спраўдзіцца.

ШТО РОБІЦЦА ДЛЯ ЭКАЛОГІІ

Ад прадпрыемства на грамадскае абмеркаванне прыйшлі тэхнічны дырэктар, юрыст і эколаг. У «прэзідыум» таксама ўвайшлі дэпутат Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Анатоль Хішчанка, намеснік старшыні Магілёўскага райвыканкама Мікалай Шапялевіч, прадстаўнікі праектнай арганізацыі, раённай інспекцыі і абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, адміністрацыі СЭЗ «Магілёў».

Спачатку слова бярэ **тэхнічны дырэктар ІТАА «Омск Карбон Магілёў» Сяргей ЛУТАВІНАЎ,** які запэўнівае, што прадпрыемства на 99,9 % бяспечнае.

— Нашы тэхналогіі адпавядаюць усім сусветным стандартам у галіне навакольнага асяроддзя, — адзначыў ён. — У прыватнасці, закуплена ўстаноўка герметычнага зліву, якая выключае верагоднасць праліву небяспечных для экалогіі прадуктаў. Мы выкарыстоўваем фільтравальную тканіну, якая дазваляе амаль цалкам улоўліваць дробныя часціцы. Вядомы расійскі вытворца кацельнага абсталявання спецыяльна зрабіў пад нашы разлікі катлы-ўтылізатары, каб утылізацыя была максімальна эфектыўная. Установлена сістэма аўтаматычнага кантролю, якая бесперапынна будзе весці маніторынг выкідаў. Збіраемся павялічыць нашы трубы ў два разы — да 140 метраў. Гэта для таго, каб павялічваць зону рассейвання і звесці да мінімуму тое, што можа аказацца на зямлі.

Потым эколаг прадпрыемства па палічках раскладвае, як будзе працаваць завод, якія найбольш небяспечныя для здароўя рэчывы пры гэтым утвараюцца, як яны будуць нейтралізавацца. Паводле яго слоў, асноўныя забруджвальнікі — дыяксід серы (амаль 58 %), аксід азоту (32 %), аксіды вугляроду (7 %).

Афіцыйныя асобы сцвярджаюць, што за дзейнасцю як прамзоны СЭЗ «Магілёў», так і кожнага яго прадпрыемства паасобку вядзецца строгі кантроль.

Анатоль ХІШЧАНКА трымае на кантролі пытанне па «Омск Карбоне Магілёў».

— Створана рабочая група, у якую ўвайшлі прадстаўнікі Мінпрыроды, Магілёўскага аблвыканкама, нашага Камітэта для маніторынгу ў раёне пляцоўкі СЭЗ «Магілёў», — паведаміў **намеснік старшыні абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Канстанцін ЦЕПЛЯКОЎ.** — Інфармацыя пра экалагічны стан на 4-й пляцоўцы СЭЗ размяшчаецца ў нас на сайце, будзем перадаваць яе і ў сельскі савет. За станам атмасфернага паветра ў населеным пункце і на мяжы санітарнай зоны СЭЗ «Магілёў» сочаць лабараторыя Магілёўаблгідрамета і санслужба. Высновы на падставе аналізу выкідаў гэтых прадпрыемстваў робіць рэспубліканскі Цэнтр аналітычнага кантролю ў галіне аховы навакольнага асяроддзя. Наладжаны кантроль і за сцёкавымі водамі, якія ідуць па канале ў раку Дзягцярка. Акрамя таго, Магілёўаблгідрамету ў хуткім часе будзе перададзена сістэма з васьмі аналізатараў, якія аснашчаны датчыкамі кантролю забруджваючых рэчываў. Гэтыя аналізатары будуць перадаваць інфармацыю ў рэжыме рэальнага часу.

Праблема ўздзеяння вытворчасці на экалогію стала галоўнай тэмай размовы.

Намеснік старшыні Магілёўскага райвыканкама Мікалай ШАПЯЛЕВІЧ, у сваю чаргу, запэўнівае, што з боку кантралюючых органаў Магілёва і Магілёўскай вобласці будзе наладжаны пастаянны кантроль, і ўдакладняе, што зараз прадпрыемства «Омск Карбон Магілёў» актыўна працуе над тым, каб максімальна ўдасканаліць сваю сістэму ачысткі.

ПАТРЭБНА ЛАБАРАТОРЫЯ І ПАДАТАК ЗА «ШКОДНАСЦЬ»

Насельніцтва ўхваляе ўсе гэтыя крокі, але лічыць, што іх недастаткова.

— Я вывучыў усе 300 старонак АУНА і знайшоў інфармацыю, што пры ветраным надвор'і выкіды могуць дасягаць двухкіламетровай зоны ва ўсходнім кірунку, — кажа жыхар Магілёва Дзмітрый. — Гэта якраз тое самае месца, дзе мы зараз з вамі сядзім. Аграгарадок знаходзіцца, лічы, у зоне максімальна магчымага шкоднага ўздзеяння.

Спецыяліст ад прадпрыемства папраўляе, што не «зона максімальна магчымага шкоднага ўздзеяння», а «зона максімальнага ўздзеяння». Маўляў, гэта прынцыпова. І ўдакладняе, што шкоднае ўздзеянне на арганізм чалавека адбываецца пры павелічэнні канцэнтрацыі шкоднага рэчыва да найбольшай дапушчальнай (НДК), а тут усяго 0,1—0,2 ад гэтай велічыні.

Людзей хвалюе таксама, ці ўлічвалася пры распрацоўцы АУНА магчымае шкоднае ўздзеянне на экалогію суседніх прадпрыемстваў. Бо сярод рэчываў, якія ўтвараюцца падчас іх дзейнасці, ёсць такія, якія, узаемадзейнічаючы, могуць узмацняць негатыўны эфект. Той жа тэхнічны вугляród, напрыклад, назапашвае на сваёй паверхні іншыя хімэлементы (з'яўляецца сарбентам) і становіцца яшчэ больш агрэсіўным. Былі пытанні і пра лесаахоўную паласу, якая ў свой час была знішчана, так што зараз практычна не засталося бар'еру паміж бліжэйшымі населенымі пунктамі і прамзонай.

— Неабходна стварыць жорсткую сістэму штодзённага кантролю за выкідамі ў атмасферу і ваду, — лічыць магілёўскі актывіст **Леанід ПЛАТОНЕНКА.** — Станцыя аўтаматычнага маніторынгу — гэта добра, але яна не вырашыць у комплексе пытанне з усімі гэтымі прадпрыемствамі. Яна зможа кантраляваць спектр нейкіх рэчываў, але не ўсіх. Гэта можа зрабіць толькі лабараторыя, і яна павінна быць. Інвестарам, якія размясцілі свае прадпрыемствы на гэтай тэрыторыі, краіна дала вельмі вялікія льготы і прэферэнцыі. Чаму б не разгледзець магчымасць, каб яны паклапаціліся пра нашу бяспеку і выплачвалі своеасаблівы «экалагічны» падатак? На гэтыя грошы можна было б стварыць лабараторыю і зрабіць узорна-паказальную ў экалагічным плане пляцоўку. Карысць была б не толькі для Магілёва, але і для ўсёй краіны. Але ўсё гэта спачатку трэба адрэгуляваць на заканадаўчым узроўні.

НА КАНТРОЛІ Ў ПРАКУРОРА

Пра тое, што прамзона СЭЗ «Магілёў» павінна знаходзіцца пад пастаянным кантролем, кажа і **Андрэй КАРАЧЭНКА, старшы памочнік пракурора Магілёўскай вобласці па наглядзе за выкананнем прыродаахоўнага закона.**

— Сёлета былі два звароты ад жыхароў Магілёва і Магілёўскай вобласці па факце выкіду шкодных рэчываў прадпрыемствам «Омск Карбон Магілёў», — канстатуе спецыяліст. — Хоць перавышэнняў канцэнтрацыі шкодных рэчываў на мяжы аб'яднанай санітарна-ахоўнай зоны і жылой забудовы мясцовыя органы санітарнага нагляду не выявілі, Рэспубліканскі цэнтр аналітычнага кантролю ўстанавіў перавышэнне шкодных выкідаў непасрэдна на крыніцы ў 40 разоў. Згодна з дзейным прыродаахоўным заканадаўствам, для ўстанаўлення факта прычынення шкоды навакольнаму асяроддзю пробы трэба ўзяць два разы ў межах інтэрвалу 30 дзён. Пасля гэтага робіцца разлік і супастаўляецца з нарматывамі. Але ў гэтым выпадку другога разу проста не было, бо пусканаладачныя работы завяршыліся. У выніку юрыдычна факт перавышэння не быў устаноўлены і падстаў для кампенсацыі шкоды не мелася. Мы праінфармавалі Генпракуратуру і прапанавалі магчымыя варыянты ўдасканалення заканадаўства шляхам перагляду нормаў. Адзін з іх — калі няма магчымасці правесці паўторныя пробы, браць за аснову нуль. Акрамя гэтага, мы прапанавалі арганізаваць на мяжы прамысловай пляцоўкі стацыянарны аўтаматызаваны пост для кругласутачнага кантролю за як мага болей шырокім спектрам рэчываў, якія ўваходзяць у склад выкідаў. Дарэчы, прадстаўнік «Омск Карбон Магілёва» вусна выказаў гатоўнасць долевага ўдзелу ў арганізацыі такога поста. Пракуратура рэкамендуе выпрацаваць методыку нармавання пахаў у населеных пунктах. Мы адчуваем стараннія пахі, якія ідуць ад прамзоны СЭЗ «Магілёў», але ніводная з лабараторый не фіксуе іх. У іншых краінах такі нарматыў ёсць. Сітуацыя на ўчастку № 4 СЭЗ «Магілёў» агаліла праблему. І мы будзем і далей кантраляваць абстаноўку на гэтай пляцоўцы.

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.

У тэму

Анатоль ХІШЧАНКА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:

— СЭЗ «Магілёў» знаходзіцца ў маёй акрузе, і гэтай тэмай я займаюся непасрэдна. Зварот ад жыхароў паступіў і да старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзіміра Андрэйчанкі. Ён даў даручэнні мне як дэпутату гэтай акругі і старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяне Кананчук разабрацца ў праблеме. Мы прыязджалі сюды, сустракаліся з кампетэнтнымі спецыялістамі, нас правялі па вытворчасці, паказалі, як яна будзе дзейнічаць. Пасля было пасяджэнне, прысвечанае гэтай тэме. Мы казалі пра тое, што распрацоўваецца закон, дзе будзе агаворвацца неабходнасць стварэння лабараторый не толькі на прадпрыемствах, але і ў зоне прымыкання да гэтых участкаў населеных пунктаў. Я за тое, каб весці адкрыты дыялог з насельніцтвам, каб усё было празрыста. Людзі скардзяцца, што не хапае зялёных насаджэнняў паміж прадпрыемствам і зонай жылой забудовы. І гэта сапраўды так. У мяне была прапанова вывесці з севазвароту тыя землі, якія знаходзяцца паміж прамзонай і населенымі пунктамі, і пасадзіць там лес. Дрэнна, што некаторыя палітызаваныя арганізацыі імкнуцца падаць усё, што адбылося, у змрочным выглядзе. Але спекуляваць на гэтым нельга. Прадпрыемства нікуды не пераедзе, бо інвестыцыі ўкладзены вялікія, а вось тэхналогію і бяспеку мы можам пракантраляваць. Падчас апошняга грамадскага абмеркавання ўзніміліся вельмі актуальныя пытанні, і я як дэпутат адпраўлю запыты ў адпаведныя органы. Буду і ў далейшым аказваць выбаршчыкам дапамогу ў адстойванні іх жыццёвых пытанняў, звязаных з абаронай здароўя і навакольнага асяроддзя.

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Наш чалавек!

НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ. З РОДНАЙ МОВАЙ І РОДНАЙ ГАЗЕТАЙ

...Добрую думку і паўтарыць не грэх. Такім чынам, самае вялікае дасягненне «Звязды» — гэта яе падпісчыкі: разумныя, працавітыя, шчырыя, гумарныя... А ўжо талентаў у іх — дык бачанянябачана.

Ну вось, напрыклад, спадар Мірановіч: ён і кіроўца, якіх пашукаць (50 гадоў працоўнага стажу!), і пчаляр, і садавод-агароднік-траўнік, і сталяр, і цясляр, і майстар па рамонце рознай тэхнікі... Выйграў электрадрыль у звяздоўскай латарэі, у рукі яго ўзяў і тут жа, у момант, выдаў, што ў гэтай прыладзе добра і што — не вельмі. «А зрэшты, — сказаў, — даронаму каню ў зубы не глядзяць. У гаспадарцы ўсё спатрэбіцца».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Трэба разумець, яна, гэта гаспадарка, у чалавека моцная. І прыгожая сям'я: жонка, дзве дачушкі, унукі, з юбілеем нават праўнук ужо віншаваў!..

Летась, пад восень, Міхаіл Іванавіч адсвяткаваў свае семдзесят! І тут вось што цікава: ледзь не ўвесь гэты час ён пражыў са «Звяздой». Ва ўсякім разе, некалі, паступаючы ў першы клас, менавіта ў гэтай газеце ён без запіначкі чытаў загалоўкі. «Мог бы міністрам стаць, калі б не машыны», — казала пра яго маці.

Сын — не стаў.

Спыталі: ці шкадуе?

Сказаў, што не — нікольк! І каб далі шанц зноўку пачаць, яшчэ раз выбраў бы тую ж прафесію, тую ж вёску Мышкавічы Кіраўскага раёна (у горадзе ён таксама пажыў), тых жа спадарожнікаў жыцця. І сярод іх — ну вядома ж — родную мову і, можна сказаць, сваю родную газету.

Рэзананс

«Трэба змалку прывучаць дзяцей да працы... А іначай — толку не будзе»

Газету «Звязда» чытаю з тых часоў, калі стала студэнткай філфака БДУ. Падпіску праводзілі ў складчыну, па чатыры-пяць чалавек на адзін асобнік, чыталі студэнты дзвюх груп. Сярод іх — Яўген Лецка, Сцяпан Лаўшук, Яраслаў Клімуць, якія потым сталі выдатнымі вучонымі-літаратуразнаўцамі. Але ж зараз пра іншае.

«Звязда», якой не здраджваю да сёння, шмат піша пра тое, як працуе цяперашні настаўнік, якія мае правы і абавязкі... Ну сапраўды, ён павінен не толькі годна выкладаць свой прадмет, але і займацца выхаваннем, разам з дзецьмі наведваць розныя мерапрыемствы, запісваць, чым вучань будзе займацца, дзе праводзіць канікулы. Цяпер, калі школьнікам дазволены бясплатны праезд у грамадскім транспарце, класны кіраўнік каля кожнага прозвішча абавязкова павінен пазначыць, колькі разоў на тыдзень вучань ездзіць на розныя секцыі, факультатывы, да бабулі і г. д. І не дай бог нешта ўпусціць, не выканаць!

Гэта — пра настаўнікаў. Зараз — пра вучняў. Калі добра ўдумацца, то іх, як і студэнтаў, можна падзяліць на тры катэгорыі: у першай — тыя, хто хоча і можа вучыцца, у другой — хто можа, але не мае такога жадання, у трэцяй — тыя, што хочуць, але не могуць, бо ім гэта не дадзена.

Першыя, дасць бог, праб'юцца, другім — усё да лямпачкі («не паступлю на бюджэт — бацькі «правучаць» за плату»), трэцім — хочацца дапамагчы.

А наогул дзецям ці не ўсё цяпер даецца лёгка: хатняе заданне, сачыненне ці пераказ, рашэнне задачы можна знайсці ў інтэрнэце. Нашто галаву ламаць і пра нешта думаць?.. Вучні, такое ўражанне, хутка развучацца чытаць, не будуць ведаць табліцы множання, алфавіта... І гэта страшна! А яшчэ страшней, што яны не прывучаны да працы: бацькі аберагаюць, кажуць, што яшчэ напрацуюцца... Але ж ці так гэта?

Мая малая радзіма — Стаўбцоўшчына. Сям'я жыла на хутары за чатыры кіламетры ад Савонскай пачатковай школы. У 1950 годзе ў першы клас там было запісана ўсяго два вучні, таму нашых бацькоў папрасілі далучыць да іх блізнят — мяне і брата. У няпоўныя шэсць гадоў.

Дабірацца ў школу нам было вельмі цяжка. Падвозіць не было на чым, бо каня, калёсы, сані, іншае гаспадарчае начынне, а таксама гумно, якое перабудавалі ў канюшню, забралі ў калгас. Адзіная палёгка, што бацька, бывала, ідучы на працу, пратоптваў нам сцежкі-дарожкі, а так крочылі самі.

У пачатковай школе нас навучылі не толькі чытаць, пісаць ды лічыць. Першая настаўніца выдавала нам кніжкі, якія трэба было прачытаць і пераказаць потым змест. Гэта таксама была наша праца...

З пятага па сёмы клас мы вучыліся ўжо ў сямігодцы, да якой ад хутара было шэсць кіламетраў. Зноў няблізкая дарога... Але мы яе праходзілі — нават зімой, у гумовых ботах, бо абуць у валёнкі чацвярых дзяцей, працуючы ў калгасе, дзе за працадні амаль нічога не плацілі, бацькі не маглі. Мы разумелі гэта і стараліся ва ўсім дапамагаць...

Потым лёс закінуў мяне вучыцца ў Мір, дзе жыла маміна сястра. Вось там школа — дзесяцігодка, беларускамоўная — была ўжо блізка, у ёй — добрыя настаўнікі, цераз рэчку — Мірскі замак, які нават запушчаны вабіў сваёю веліччу. Шчаслівыя гады!

А калі ўвогуле, ва ўсіх гэтых школах вучняў прывучалі да працы: мы збіралі ў садзе яблыкі, рассцілалі на лузе льнотрасту, убіралі капусту, капалі бульбу, напярэдадні выпускных экзаменаў два дні, помню, уручную садзілі кукурузу. І хоць дзесяцігодку я закончыла з сярэбраным медалём, але студэнткай БДУ стала толькі праз два гады — у той час для паступлення (і медалістам таксама), апроч ведаў, патрэбен быў стаж: два гады я працавала ў калгасе памочнікам брыгадзіра...

Пасля заканчэння БДУ была аспірантура, абарона дысертацыі, 44 гады стажу. А працы — дык усё жыццё.

Для чаго пра гэта пішу?

На мой погляд, першаасновай выхавання павінна быць сям'я, а затым ужо школа, працоўны калектыў. Змалку дзяцей трэба прывучаць да працы, ашчадных адносін да кавалка хлеба, адзення, абутку... Яны павінны ведаць, адкуль што бярэцца, як набываецца, а інакш — толку не будзе. Ад лёгкага жыцця дзеці будуць цягнуцца да розных «прыгод».

І яшчэ: абавязковым складнікам у выхаванні з'яўляецца асяроддзе, стасункі з іншымі людзьмі, пошук добрых сяброў, бо дрэнныя (як спяваецца ў песні) знойдуцца самі.

Зінаіда Пятроўна Данільчык,
г. Гродна.

Каб помнілі...

«ПАД КУЛЯМІ ХАДЗІЛА, А ПАРАНЕНАЙ НІ РАЗУ НЕ БЫЛА»

У нашым школьным музеі гэты экспанат нічым такім не вылучаецца: кавалачак цэглы — гладка-глянцавы, як паліраваны. Яго з разбуранага Сталінграда прывезла — светлай памяці! — Антаніна Аляксееўна Лучонак.

Антаніна з баявымі сяброўкамі.

У маленстве ды маладосці яна, як іншыя, марыла аб шчаслівым жыцці, збіралася вучыцца на акушэрку. Гэтага хацеў яе бацька. Ён такім чынам спадзяваўся «адлучыць» сваю дачку ад будзёншчыны, ад цяжкай вясковай працы, якой самому хапіла напоўніцу: рана аўдавеўшы, Аляксей Данілавіч адзін гадаваў чацвярых дзяцей (Тося была старэйшай), будаваў для сям'і новую хату. Па тых часах — гэта бясспрэчна — ён быў багатым: меў зямлю, каня, кароў, авечак... За што і паплаціўся: забралі яго, а ўслед — зруб хаты, будматэрыялы, прадукты...

З турмы Аляксей Данілавіч так і не выйшаў. «Быў неспраўдліва асуджаны», — прызналі ў 50-х, але дзецям ад гэтага хіба лягчэй?!

Той самы кавалачак цэглы.

Тым не менш — вучобу Антаніна не кінула: атрымала адукацыю, уладкавалася на працу ў Мінск, у дзіцячую бальніцу. Эканоміла, каб нешта купіць, каб неяк абжыцца, але...

Грымнула вайна: першыя баі, страты, адступленне. Раненых — шмат... Акружэнне...

Выходзіла з яго цераз балота і не адна. Ноччу ішлі, а ўдзень хаваліся... Праз два тыдні неяк выйшлі да сваіх, дзе атрымалі які-ніякі прытулак.

Далей быў Харкаў, сапёрны батальён, а калі яго разбілі — палявы шпіталь у Сталінградзе, і ўсю вайну — патокі раненых, бясконцыя перавязкі і кроў. Часам, як расказвала Антаніна Аляксееўна, ёй самой хацелася, каб злёгку параніла, каб хоць трохі адпачыць... Але ж потым (адкуль і сілы браліся?) ішла пад бамбёжкі, ратавала іншых.

Найгорш, як згадвала, было пад Сталінградам: там першы раз у жыцці яна ўбачыла волжскую ваду, чырвоную ад чалавечай крыві... А ўжо разбураны горад... Цэгла там проста плавілася, ператвараліся ў бясформенныя кавалкі: экспанат у школьным музеі — якраз адтуль...

Аднак — дзіва дзіўнае — вось гэту дзяўчыну Бог шкадаваў. Яна, як расказвала, вады баялася, плаваць не ўмела — цераз рэкі пераплаўлялася, пад агнём і кулямі хадзіла, — а параненай ні разу не была!

Яе, старшыну медыцынскай службы, ваенныя шляхі прывялі ў Берлін: там сустрэла Перамогу, там на будынку рэйхстага адшукала месца, каб напісаць сваё кароткае дзявочае прозвішча — Шут.

У ліпені 1945-га яна вярнулася дамоў, пайшла працаваць у мясцовую бальніцу, выйшла замуж, нарадзіла трох сыноў, даглядала мужа-інваліда. Пазней — не магла нарадавацца ўнучцы.

...Гляджу на фотаздымак гэтай прыгожай жанчыны і думаю: колькі сілы аказалася ў ёй, слабай на першы погляд, колькі мужнасці. Сведчаннем таму ордэн Айчыннай вайны, медалі «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда», «За перамогу над Германіяй»...

У тым, што яна адбылася, вялікая заслуга і нашых землякоў.

Валерый Захараў, намеснік дырэктара Хутарскай СШ,
Чэрвеньскі раён.

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.

Спецыяльны рэпартаж

НЕ ПОЛЬКАЙ АДЗІНАЙ

Дзе хаваецца сапраўдная нацыянальная культура беларусаў?

У Пружанах прайшоў VII абласны фестываль фальклорнага мастацтва «Радавод». Карэспандэнт «Звязды» на два дні акунулася ў атмасферу народнага свята — вучылася ткаць, танчыла «Обэрэка» пад дождж і збірала старадаўнія рэцэпты бабулінай смакаты.

Мотальскія гарманісты скралі ўсе дзявочыя сэрцы на фестывалі.

Сонца яшчэ не ўзнялося над трохпавярховікамі ў цэнтры Пружан, а на плошчу перад Палацам культуры ўжо не праціснуцца. Яна гудзе і варушыцца, быццам вулей. Толькі замест пчол — дзеці ў нацыянальных строях, якія з'ехаліся сюды з усіх куткоў Брэстчыны.

— Абудзім гэты горад? — бадзёра пытаецца нехта ў мікрафон.

Натоўп у адказ суцішваецца на імгненне, а пасля тысячагалоссем зацягвае старажытную абрадавую песню: «А мы просо сіялы, сіялы. Зеленая наша дуброва, дуброва...»

Неарганізаваная на першы погляд людская плынь нечакана разбіваецца на дзясяткі карагодаў, якія пачынаюць круціцца ў розныя бакі з рознай хуткасцю. Паступова абрад перацякае ў грандыёзнае шэсце па адной з цэнтральных вуліц горада. Ад такога відовішча і матываў, якія сыходзяць каранямі ў дахрысціянскія часы, дух перахоплівае. Харасство!

Сябе паказаць, на людзей паглядзець

Калі вы ніколі не чулі пра «Радавод», то я вам шчыра спачуваю і настойліва раю не прапусціць яго ў будучым. Чым жа гэты фальклорны фестываль адрозніваецца ад усіх астатніх? Удзельнікі — дзеці і моладзь, якія ў майстэрстве народных спеваў і танцаў часам пераўзыходзяць нават дарослых. Да таго ж канцэртныя праграмы тут заўжды разбаўленыя навуковымі, рамеснымі і кулінарнымі. Асалоду атрымлівае не толькі душа, але і галава са страўнікам! Што важна — фестываль цалкам пазбаўлены камерцыйнасці.

Сёлета месцам правядзення «Радавода» абралі Пружаны. Па-першае, гэта малая радзіма знакамітага дырыжора, кампазітара, фалькларыста і этнографа Рыгора Шырмы. Па-другое, тут ёсць шыкоўная сядзіба XIX стагоддзя, якую мясцовыя завуць «палацыкам». Менавіта яна стала цэнтрам прыцягнення для маладых аматараў фальклору. Перад будынкам пад векавымі ліпамі і дубамі разгарнуўся «Горад майстроў», куды і трапілі ўдзельнікі фестывалю пасля шэсця па горадзе. Надзвычай прыемна было ўбачыць у гэтым самым «горадзе» выключна сапраўдных майстроў. Усе даўно прызвычаіліся, што шматлікія фэсты з ухілам на аўтэнтыку запаланілі прадаўцы штампаваных імпартных тавараў. Здаецца, там гандлююць усім, акрамя рэальных вырабаў ручной работы ад мясцовых майстроў. «Радавод» у гэтым плане зрабіў мудра — запрасілі рамеснікаў не для таго, каб гандляваць, а для таго, каб правесці майстар-класы для ўсіх ахвотных. Хочаш — вышывай, хочаш — сядай за ганчарнае кола, хочаш — распісвай яйкі воскам.

Вось выхаванцы Малоткавіцкай сярэдняй школы (Пінскі раён) сядзяць за кроснамі і заклікаюць народ ткаць пярэсценькія палавічкі. Пружанскія дзеці плятуць саламяныя коскі, якія праз некалькі гадзін можна будзе сабраць у капелюшы для танцораў. Мой погляд чапляецца за распісныя гліняныя фігуркі.

— Гэта работы вучняў Ланской школы Маларыцкага раёна. Яны ў сябе гліну капаюць і лепяць з яе вось такіх беларусікаў. Асабліва сь — гатовыя фігуры агнём не абпальваюць, а даюць высахнуць натуральна. Таму фарбы на іх добра кладуцца, — тлумачаць прадстаўнікі Маларыты.

Заўважаю яшчэ адзін цуд — драўляныя клубніцы. Здагадацца, адкуль яны, нескладана. «Лунінецкі раён — клубнічны край, а яшчэ месца, дзе жывуць адны з найлепшых разбяроў па дрэве», — зазначае педагог Сяргей Гнедзька, пакуль яго вучні засяроджана паказваюць астатнім, як трэба працаваць лобзікам. Хлопцы абяцаюць, што да канца «Радаводу» будзе гатовы цэлы набор драўляных лыжак.

Самым маленькім удзельнікам фестывалю інструмент у рукі не даюць, але яны на гэты конт не перажываюць: іх не адарваць ад «скрыні з цудамі» — батлейкі, за якой хаваюцца вучні сярэдняй школы № 18 горада Пінска. «Старажытны тэатр з'явіўся ў нас дзякуючы настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. Дзеці і іх бацькі сваімі рукамі змайстравалі батлейку і пашылі лялек. А спецыяльна да «Радаводу» выхаванцы тэатральнага гуртка паставілі класічную п'есу «Цар Ірад». Яна не страчвае актуальнасці і заўсёды цікавая гледачам», — расказаў акцёр Андрэй Дзмітрычэнка, які выкладае тэатральнае майстэрства ў 18-й школе.

Смачны майстар-клас разгарнулі паненкі з Высокага. Іх у «Горадзе майстроў» знаходжу па салодкім водары свежага печыва.

— Падыходзь, не саромейся! Галоднай не адпусцім, — клічуць да стала дзяўчаты і частуюць румянай булачкай: — «Бусню, бусню, на тобі галёпу, дай мне жыта копу», — кажуць у нас, калі пякуць такія прысмакі на Дабравешчанне. Рэцэпт даць?

Не ляжы на пячы ды не псуй кірпічы...

— ...Разам з намі заспявай, на гармошцы заіграй! — рэха ляціць па старым парку за сядзібай. Выступленні ансамбляў, гуртоў, аркестраў і вакалістаў разгарнуліся адначасова на пяці (!) пляцоўках горада. Усё ж галоўныя на фальклорным фестывалі — песня і танец. Яны панавалі паўсюль, і іх не змог спыніць нават раптоўны лівень. Уявіце карціну: неба шчодра палівае вышытыя кашулі і саламяныя капелюшы, але дзеці гэтага не заўважаюць — крочаць па лужынах з песнямі, яшчэ ў барабан пастукваюць!

— Адкуль такія галасістыя? — пытаюся ў хлопчыка з канапушкамі, які ад душы зацягвае куплеты пра каханне на адной з прыбужскіх гаворак.

— Хаціслаўскія мы! — з гонарам выкрыквае спявак, весела адскокваючы.

Удзельнікі фестывалю — пераважна школьнікі. Прычым тут на роўных выступаюць як першакласнікі, так і выпускнікі. Напрыклад, ва ўзорны фальклорны ансамбль «Сунічка» (вёска Вулька-1, Лунінецкі раён) дзеці трапляюць амаль адразу, як прыходзяць у школу.

— Гэта не рана, наадварот, вельмі арганічна. Менавіта ў такім узросце трэба закладваць падмуркі любові да сваёй культуры — бабуліных спеваў, да матчынай вышыўкі і дзедавых найгрышаў на гармоніку. Спазніцца на год-другі — і ўсё, не зможаш зацікавіць дзіця «Крыжачком» і ігрой на дровах. Асабліва ў імклівы час гаджэтаў і камп'ютарных гульняў, — разважае **кіраўнік ансамбля Уладзімір КАЛЯНКОВІЧ.** — Наш калектыў існуе з канца 80-х гадоў, і мы ганарымся, што нават самыя першыя выпускнікі «Сунічкі» зараз памятаюць, як трэба танчыць «Падэспань» і могуць заспяваць мясцовыя прыпеўкі.

Дарэчы, пра песні. Калі трапляеш на канцэрты «Радаводу», то ўзнікае пачуццё, што чуеш дзясяткі розных моў — настолькі адрозніваюцца паміж сабой гаворкі Брэсцкай вобласці. Разам з тым кожную з іх ты разумееш.

Сустракаюцца на фестывалі і «фальклорныя перліны» — песні і танцы, уласцівыя толькі адной асобе. Яго немагчыма ўявіць без замежных гасцей — дзіцячых фальклорных калектываў іншых славянскіх краін. Сёлета паказаць сябе прыехалі палякі з Падляшша, расіяне з Волагды і сербы з горада Топола і вёскі Дрэнавац.

— Мы тут не ўпершыню. Не маглі прапусціць шыкоўны фестываль, які аб'ядноўвае столькі дзяцей, — расказаў **мастацкі кіраўнік сербскага ансамбля «Опленец» Міраслаў БЛАГАЕВІЧ.** — Фальклор — гэта не пра адукацыю і магчымасці. Гэта пра талент і шчырую цікавасць да сваёй нацыянальнай культуры. Я ўсё жыццё прысвяціў медыцыне, але гэта ніколі не перашкаджала мне займацца народнымі танцамі і спевамі, прывіць любоў да іх свайму сыну і ўнуку. Я бачу, што беларусы таксама «гараць» фальклорнай тэмай. Гэта нас збліжае.

Па традыцыі, фінальную кропку на фестывалі паставіў конкурс традыцыйных бытавых танцаў. Пераможцамі сёлета сталі выхаванцы сярэдняй школы № 13 г. Баранавічы і СШ № 2 г. Століна. Аднак сутнасць нават не ў тым, хто стане першым. Хоць конкурс і нагадвае чымсьці спартыўнае спаборніцтва, паколькі праходзіць этапна (ад 1/8 да фіналу), а пары змагаюцца за званне лепшых у чатырох узроставых катэгорыях. Цікавасць у тым, што кананічнага выканання таго ці іншага танца не існуе — удзельнікі паказваюць, як скакалі на вячорках менавіта ў іх мясцовасці. «Базар», «Каханачка», «Мяцеліца», «Ойра», «Какетка», «Зайчыкі», «Кракавяк», «Обэрак», «Ночка»... Ёсць яшчэ незвычайны танец, які мае адразу чатыры назвы — «Лысы», «Надзя», «Карапет» і «Зялёная рошча». Адным словам, не полькай адзінай могуць пахваліцца беларусы!

Ганна КУРАК, фота аўтара, *Мінск — Пружаны — Мінск.*

Батлейка прыцягвае дзяцей, як і пяць вякоў таму.

Даведка

«Радавод» з'явіўся ў 2004 годзе і праводзіцца з перыядычнасцю раз у тры гады.

Аўтар праекта — Вера ВОЛКАВА. Пад эгідай фестывалю ладзяцца занальныя агляды фальклорнай творчасці дзяцей і моладзі, семінары-практыкумы і майстар-класы, у якіх удзельнічае больш за 20 тысяч чалавек. На фінальныя мерапрыемствы адбіраецца толькі тысяча лепшых музыкантаў, вакалістаў, танцораў і майстроў Брэстчыны, а таксама запрашаюцца замежныя госці. Месца правядзення «Радаводу» кожны раз мяняецца: фестываль ужо прымалі Брэст, Іванава, Кобрын.

Слова эксперту

Наталля МАТЫЛІЦКАЯ, фальклярыст, спявачка, старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ, член журы фестывалю:

— Сёння ў вясковых ДК мы назіраем такую карціну: дзясятак жанчын і адзін гарманіст. А душа просіць танца, таму нашыя кабеты і вымушаныя скакаць польку без кавалераў. Гэта ненармальна! У дарэвалюцыйны час усе мужчыны ўмелі і спяваць, і танцаваць. Не саромеліся, а наадварот, імкнуліся сябе паказаць. Бо як не здольны да танцаў, то ні адна дзяўчына за цябе замуж не пойдзе. А цяпер? Калі хто песню зацягне, навакольныя думаюць, што чалавек гарэлкі перабраў... Успрыманне спеваў, на жаль, перавярнулася на 180 градусаў: цяпер мы іх быццам саромеемся. А між іншым, Рыгор Шырма казаў, што песня — душа народа. Хто спявае, у таго душа жывая і здаровая...

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Генадзь Мішчук нарадзіўся праз 25 гадоў пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, таму, зразумела, яго ўяўленні пра яе грунтуюцца на пераасэнсаванні чужога жыццёвага вопыту, на прачытаных кнігах і прагледжаных кінафільмах. Ці дастаткова гэтага, каб напісаць апавяданне, якое пакідала б уражанне, што напісана праўдзіва? Безумоўна, так, і ў якасці прыкладу можна прывесці неверагодна вялікую колькасць мастацкіх твораў на гістарычную тэму. Праўда, усё ж пры адной, ці не самай важнай умове: твор павінен быць таленавітым. А ці ўдалося Генадзю Мішчуку стварыць такое апавяданне, чытачы «Звязды» могуць меркаваць самі, прачытаўшы яго.

Алесь БАДАК.

Апавяданне

ПАЧАТАК

ЕЎДАКІЯ прачнулася на досвітку ад глухіх раскатаў грому. Адхінула фіранку: «Няўжо навальніца?» — трасянула за плечы мужа.

— Уставай, Серафіме, нешта няладнае.

Гаспадар, якому жонка перабіла салодкі ранковы сон, штосьці прабурчаў, крыху пасядзеў на ложку і пачаў павольна апранацца. Грымоты не сціхалі. Серафім выйшаў з хаты, на падворку агледзеўся. Палымнеў усход. Сонца пафарбавала небасхіл ружовай чырванню, ды так густа, што тая, сцякаючы, зачапіла верхавіны цёмных дрэў. Але дзіўным было другое: захад таксама палыхаў агнём. Здавалася, што два сонцы адразу ўстаюць над зямлёю.

— Што гэта, Серафіме? — занепакоена спытала жонка.

— А бог яго ведае. Мо пажар, а можа, манеўры. Што тут гадаць, пайду лепей гаспадарку агляну.

Ля хлеўчука ён спыніўся, прыслухаўся да грымотаў. Яўна не навальніца. А што, калі гэта вайна? Вунь колькі мужыкоў з суседніх вёсак і хутароў на вайсковыя зборы забралі. У самую касавіцу... Нездарма гэта, ой, нездарма... Ды і лектар, што нядаўна ў лясніцтва прыязджаў, сваёй прапагандай толькі занепакоенасць у сэрцы пасяліў. Гітлер, маўляў, са Сталіным цяпер сябры. Дагавор аб ненападзенні... А калі ж яны такімі сябрамі сталі? Немец пад сябе амаль усю Еўропу падмяў, а бацька ўсіх народаў куды глядзіць? Ды аб гэтым лепей маўчаць. Ёсць кавалак хлеба — і трымай язык за зубамі. А то, чаго добрага... Хто дзяцей пагадуе? Брат Мікалай? У яго сваіх чацвёра. Нядаўна вось у райцэнтр дачку вазіў — захварэла. Параілі яму да старой палячкі звярнуцца, яна лепшая за сталінскіх дактароў. Дык казаў, што старая ўвесь час, як дачку аглядала, плакала і паўтарала: «Война будзе, война будзе». Грошы ні капейкі не ўзяла, а дачку ў імгненне вока на ногі паставіла. А што, калі і сапраўды вайна пачнецца?

Сонца ўзнялося высока ў неба, і трывожнага зарыва ўжо не было відаць. Толькі грымотнае рэха лякала наваколле. Час збірацца на працу. Сёння чарга Серафіму дзяжурыць у будынку лясніцтва. Па будных днях там начальства сядзіць, па выхадных — леснікі чаргуюць. Хоць і шкада выхаднога дня, а што зробіш? Жонка сабрала торбу, сняданак на стол паставіла. Дзеці, пачуўшы пах варанай бульбы з салам і цыбуляй, без матчыных угавораў прахапіліся, каб паснедаць разам з бацькам. Чацвёра іх у яго. Старэйшая дачка ўжо да замужжа рыхтуецца. На восень чакай сватоў. І пойдзе яго крывінка да другой сям'і, а там хто ведае, як лёс складзецца. Вось сынкі-пагодкі — іншая рэч. Гэта галоўная надзея і багацце Серафіма. Будзе каму працаваць на зямельцы, як свет не раскідаецца.

— Татка, а хто гэта грукоча? — пытаюцца малыя, па-гаспадарску намінаючы картоплю.

— Ды мужыкі гэта з суседніх вёсак да гораду на кірмаш падаліся. Вось падводы і грукацяць па бруку, — ці то жартуе, ці то суцяшае дзяцей Серафім, а ў самога сэрца сціскаецца ад тугі і трывогі.

— Ну, дзякуй богу за хлеб надзённы, час ехаць. Бывайце здаровы, матку слухайце. Еўдакія, як што, сена на ўзмежку зграбіце. Здаецца, на дождж збіраецца...

Пры чарговай хвалі кананады конь вушамі стрыжэ. І яму, відаць, трывожна. Чуе скаціна бяду, што не кажы. А дзень абяцае быць добрым. Эх, шчасце чалавечае! Што каму, а Серафіму многа не трэба. Абы хутарок яго стаяў ды сямейка здаровая была. Хай усюды людзі жывуць у цішыні і спакоі. За што тут сварыцца, за што ваяваць? За мяжу ці разору? Хапае той зямлі і лесу. Вось як бяда здарыцца ці хвароба ўваб'ецца — нічога не трэба. Але, каб чалавек не заносіўся, каб шанаваў тое, што ёсць, і бяда ў пэўнай меры карысная. Бо дай волю — чалавек на неба можа залезці, каб Бога за бараду трасянуць.

Вузкая сцежка вывела конніка на дарогу, і Серафім не ўтрымаўся, тузануў лейцы, і конь шпарка паскакаў праз густы хвойнік.

У будынку лясніцтва — дабротнай апаляванай хаціне з шырокімі вокнамі, у якія заўсёды ўглядаецца векавы лес, мітусіліся людзі. Начальства выносіла з кабінета ўсю нейкія паперы і трамбавала ў легкавік, што стаяў заведзены ля самага ганка. На Серафімава прывітанне ніхто не адказаў. А па шэрых і напружаных тварах людзей ён зразумеў, што здарылася нешта страшнае. Каб не заважаць, ён праціснуўся ў невялічкі пакойчык, куды звычайна ўсе збіраліся на перакур. Тут у клубах шэрага тытунёвага дыму на шырокай лаве сядзеў стары Хведар-ляснік з Залесся, чалавек паважаны і дасведчаны.

— Вайна, Серафіме, вайна... — замест прывітання першым прабасіў ён. — У райцэнтры ўжо ёсць загінулыя і параненыя. Нямецкія самалёты ноччу бомбы скінулі...

— Вайна?! Як вайна? Абяцалі ж, што не будзе...

— Нас, браце, з табой не спыталі...

У пакойчык ускочыў галоўны інжынер і рэзка абарваў іх размову.

— Без панікі! Агрэсар будзе разбіты ў найбліжэйшыя дваццаць чатыры гадзіны. На сёння ўсе вольныя. Вяртайцеся дамоў і чакайце далейшых указанняў!

Апусціўшы галовы, Серафім і Хведар падаліся да выхада. Ішлі моўчкі, ведучы коней за лейцы, пакуль будынак лясніцтва не знік з вачэй.

— Што ж то будзе, Хведар? — першым загаварыў Серафім.

— Што будзе? І ўявіць цяжка. Ты юнаком у бежанцах быў, а я з германцам у першую імперыялістычную біўся. Ён тады ўжо газамі нас труціў... Дзяцей і ўнукаў шкада.

— Дык і ў нас армія магутная. Вунь інжынер абяцаў, што любому агрэсару ў дваццаць чатыры гадзіны рогі зламаем.

— Тое і бяда, што такія інжынеры ў арміі камандзіры, дый увогуле... Раздумаешся, Серафіме, навошта толькі на гэты свет нарадзіўся...

На скрыжаванні па-сяброўску развіталіся і падаліся кожны ў свой бок.

Ад страшнай навіны Еўдакія ледзь не самлела.

— Ай, дзетачкі мае, дзетачкі, — галасіла яна, і слёзы, як боб, каціліся па яе шчаках. — Навошта я вас на свет нарадзіла? На вечныя пакуты...

Малыя, як птушаняты, туліліся адно да аднаго і шморгалі насамі, не разумеючы, што такога страшнага нарабілася ў свеце.

— Што будзе? Што ж то будзе?! — галасіла Еўдакія.

Крывавае сонца павольна скацілася за цёмную сцяну бору. Дзень скончыўся. Напярэдзе была ноч, поўная смутку і жалобы, ноч трывог і напружанага чакання. Не было сну Серафіму, не спала Еўдакія, ад грымотнай кананады варочаліся ў сваіх ложках дзеці. Шум з лесу за вокнамі ўпершыню за жыццё навяваў страх.

Апоўначы ў дзверы Серафімавай хаты пастукаліся. Жонка схамянулася і з трывогай глянула на мужа. Серафім запаліў газоўку і выйшаў у сенцы.

— Хто там?

— Свои, — па-руску адказаў стомлены голас.

У святле лямпы Серафім убачыў ля дзясятка салдат у запыленых чырвонаармейскіх гімнасцёрках. Адзін з іх быў паранены. Забінтаваная наспех рука ў цёмных разводах крыві сведчыла аб сур'ёзным раненні.

— Здравствуй, отец! Нам бы водицы да хлебушка...

Высокі віхрасты хлопец з абветранымі вуснамі ў афіцэрскай гімнасцёрцы ціха звярнуўся да яго. Яны прагна пілі ваду, па чарзе перадаючы конаўку, а Серафім пільна ўглядаўся ў кожную постаць. Еўдакія вынесла бохан хлеба, сала, высыпала з чыгунка дзясятак вараных бульбін.

— Частуйцеся...

— Спасибо, а может, у вас медикаменты какие имеются, у нас товарищ раненый...

Серафім вынес з каморы пляшку гарэлкі.

— Бярыце, іншага няма... Куды ж вы цяпер?

— К своим пробиваться будем.

— А дзе ж тыя свае?

Адказу не было. Цёмныя постаці байцоў хутка зніклі ў лясным гушчары.

Серафім вярнуўся ў хату. Жонка плакала. Толькі плакала ўжо моўчкі, каб не разбудзіць дзяцей.

— Супакойся, Еўдакія, не трэба... Можа, усё яшчэ абыдзецца, — сказаў ён, суцяшаючы ці то жонку, ці то сябе, і не распранаючыся прылёг на шырокую лаву.

Чаму ў цяжкія хвіліны час цягнецца так марудна, а ў хвіліны бязмернага шчасця — імклівa ляціць? Так хацелася Серафіму заплюшчыць вочы, заснуць і прачнуцца ў іншым свеце — спакойным і зацішным, без вайны і гора, дзе можна жыць і працаваць, гадаваць дзяцей і радавацца кожнаму дню. Ён ляжаў і думаў аб шчасці. Учарашнім ранкам Серафім быў шчаслівым чалавекам...

На золку да іх зноў пастукаліся. На ганку стаяла чацвёра ўзброеных людзей у такіх жа запыленых, пасечаных гімнасцёрках. Адзін з іх — сярэдняга ўзросту, у фуражцы і партупеі, з афіцэрскімі «шпаламі» і бліскучым медалём — падышоў да Серафіма, павітаўся і ціха папрасіў:

— Нам бы перакусить чего. Больше суток без пищи.

Серафім, як зачараваны, глядзеў на яго медаль.

— Что с вами, товарищ?

Ваенны мякка крануў яго за плячо. Серафім схамянуўся.

— Паесці?! А дзе ж вашы паходныя кухні, танкі, самалёты?

Роспач ахапіла Серафіма. Ён глядзеў то ў вочы афіцэру, то на яго бліскучы медаль.

— Вы адступаеце хто куды, нас пакідаеце, а вас кармі?! Дзе ж я на вас усіх набяруся? У мяне чацвёра дзяцей, разумееш? Чацвёра! Іх таксама карміць трэба. Табе медаля за што давалі, каб ты па карчах хаваўся?

— Серафім, апамятайся! — з хаты выбегла жонка і паспрабавала ўмяшацца. — Яны ж не вінаватыя, — праз слёзы гаварыла яна.

— А хто вінаваты? Хто? Хто нас абароніць?

Серафім, бы знясілены, апусціўся на прызбу і закрыў твар рукой.

— Прости, отец...

Афіцэр панура схіліў галаву і разам са сваімі падначаленымі падаўся да лесу.

...Серафім дагнаў іх у канцы старой грэблі.

— Прабачце, сынкі, калі можаце, прабачце. Бога за вас маліць буду... Забудзьце мае словы, у гарачцы і роспачы сказаныя. І гэта прыміце ад чыстага сэрца, што ёсць...

У льняным ручніку ляжала галоўка сыру і кавалак хлеба. Чалавек з бліскучым медалём нетаропка падышоў да Серафіма. Яны моўчкі глядзелі адзін аднаму ў вочы і ледзь стрымлівалі слёзы. Пачынаўся другі дзень вайны. Жудаснай і крывавай, якая знішчыць і пакалечыць дзясяткі мільёнаў людзей. Бы пачварная істота, нахабна ўварвецца ў шчаслівае жыццё прыгожых гарадоў і ціхіх вёсак. Зруйнуе мары і надзеі некалькіх пакаленняў. Ды толькі мацнейшай за варожыя гарматы і танкі, мацнейшай за любую варожую зброю будзе сіла чалавечага духу, сіла воіна-абаронцы, які зараз стаяў перад Серафімам.

— Прости и нас, отец. За всё. — Узяў ежу і нізка пакланіўся.

Серафім доўга глядзеў на іх постаці і ў апошняе імгненне не стрымаўся і крыкнуў наўздагон:

— А як завуць цябе, чалавеча?

— Иваном. Мы все, отец, Иваны, — ціхае рэха прынесла адказ.

Генадзь МІШЧУК.

Спытайце пра радзіннае

Што рабіць з надмагільным крыжам?

«Прайшоў год пасля смерці бацькі, і мы паставілі помнік. Застаўся крыж, што з ім рабіць далей?» — гэтае пытанне даслалі ў рэдакцыю нашы чытачы з Фаніпаля.

Нядаўна мы таксама наводзілі парадак на Грабёнскіх могілках, што ў Чэрвеньскім раёне (абнаўлялі аградкі), і зноў сутыкнуліся з непаразуменнем, якое не проста кідалася ў вочы, а брала за жывое. Каля ўвахода на могілкі ляжала гара смецця, сярод якога можна было ўбачыць шмат драўляных надмагільных крыжоў. Душа балела ад нашай бездапаможнасці і неахайнасці, а яшчэ больш — ад няведання адвечных традыцый і адсутнасці культуры падтрымання парадку на могілках.

Папярэднія пакаленні беларусаў таксама ставілі крыж на магіле пасля пахавання. Часцей вясной на Радаўніцу або Наўскі Вялікдзень (чацвер пасля Вялікадня), радзей восенню на Дзяды, Дзімітраўскія, Міхайлаўскія менавіта на крыжах з'яўляліся прадметы штогадовага абнаўлення. На надмагільныя крыжы (знак роўнасці перад Богам) прымацоўвалі або павязвалі адпаведныя знакі-сімвалы: на магіле дзяўчыны — белы вянок; на магіле жанчыны — белы фартушок; над магіламі мужчын ціха пялёскаліся саматканыя белыя ручнікі. У Мядзельскім, Бабруйскім, Смалявіцкім раёнах нам даводзілася бачыць, як на крыжах, якія стаялі над магілкамі хлопчыкаў, былі павязаны вузкія паясы.

Сёння надмагільны крыж — пазнавальны знак канфесіянальнай прыналежнасці нябожчыка, які ўзвышаецца над магілай і «замыкае» кампазіцыю сфарміраванай зоны смерці, — «красуецца» толькі год. У адпаведнасці з універсальным рытмам традыцыйнай культуры 0-3-9-40-1, год праз год на магіле паставяць свецкі знак — помнік.

А далейшая гісторыя крыжа можа пайсці зусім рознымі шляхамі. З аднаго боку, некаторы час існавала традыцыя, якая патрабавала, перш чым узвесці над магілай гранітны помнік-комплекс (у вельмі шырокім дыяпазоне варыянтаў увасаблення)... выбіраць зямлю на 20—30 см і пакласці туды драўляны крыж.

Існуе і такі варыянт, даволі распаўсюджаны ў Беларусі: пасля таго як пастаўлены помнік, крыж кладуць збоку ад магілы, і ён знаходзіцца там яшчэ на працягу двух-трох гадоў. Калі пад уплывам сонца і паветра драўляны крыж страціць сваю форму, яго выкідваюць на сметнік як звычайную побытавую рэч, якая адслужыла свой век.

У славянскай традыцыі існаваў звычай: двойчы на год (а ў некаторых месцах і больш) неабходна было ачысціць зямлю ад усялякай старызны. Таму на Масленіцу і на Купалле хлопцы збіралі стаптаныя лапці, паламаныя кашы, струхлявелыя бароны і спальвалі на вогнішчы. Было б выдатна, калі б мы адрадзілі гэтае правіла ў дачыненні да нашых могілак: перад Радаўніцай сабраць усе непатрэбныя крыжы ў адно месца і спаліць. Лепш так, чым назіраць за тым, як яны валяюцца ў гары смецця.

Ёсць яшчэ адзін варыянт незвычайнага лёсу гэтых крыжоў. Гэтую традыцыю з суседняй Літвы пераняў калісьці ксёндз Булька ў вёсцы Мосар Глыбоцкага раёна. Мясцовыя могілкі ўваходзяць у вельмі прыгожы паркава-касцёльны ансамбль і выразна сведчаць аб тым, што могуць зрабіць людзі, аб'яднаныя адной ідэяй. На мясцовых могілках, якія размешчаны на пагорку, наведзены ідэальны парадак, а ў супрацьлеглы бок ад могілак і касцёла скіравана дарога на мясцовую Галгофу. Паабапал дарогі ў якасці зямной ахвяры Нябеснаму Збавіцелю ўзвышаюцца дзясяткі крыжоў, розных па форме, па сімвалічным сэнсе, памерах. На кожным з іх маецца пазнака аб той сям'і, якая прынесла гэтую ахвяру і якая, трэба думаць, тым самым засведчыла пошук адвечных ісцін. Гэты вопыт можна смела пераймаць і такім чынам вырашыць праблему эстэтызацыі сакральнай прасторы могілак.

Сёння ў многіх вёсках вяртаюцца на свае колішнія месцы крыжы-абярэгі, якія ставілі на пачатку вуліцы або на скрыжаванні дарог. Гэты крыж быў своеасаблівым цэнтрам вясковага свету; перад ім спынялася пахавальная працэсія, схілялі галаву для благаслаўлення маладыя, якія вярталіся з-пад вянца, хрысціўся той, хто кіраваўся ў далёкую дарогу, і той, хто ўжо адолеў яе і вяртаўся да роднага парога. Ганарышся і радуешся за культуру сваіх продкаў і веданне традыцый тутэйшых жыхароў, калі бачыш, як на прыдарожных крыжах, якія стаяць пасярэдзіне або на ўскрайку вёскі і выконваюць ахоўна-засцерагальную функцыю, павязаны адначасова і ручнік, і вянок, і фартушок, таму што крыжы прызначаны перасцерагчы ўсіх жыхароў вёскі: малых і старых, дзяўчат і хлопцаў.

Тую ж ролю будзе выконваць і ўкрыжаваны курган памяці па тых, перад кім мы заўсёды схіляем галовы, просім прабачэння і спадзяемся на маўклівую згоду-падтрымку. У такім разе мы наладзім жывую повязь часу (мінулага і сённяшняга) і самі створым тое капішча, якое паяднае нас не толькі марай заўтрашняга дня, але і каштоўнасцямі старадаўняй традыцыі. Тады дарога ад чырвонага кута роднай хаты да магіл сваіх продкаў будзе пазначана крыжамі памяці.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні аб каранях і прыстасаванасці да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

Извещение о проведении повторных электронных торгов	
Организатор аукциона	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703
Продавец	ООО «Стройдормашлизинг», г. Минск, ул. Кропоткина, д. 91, пом. 7, к. 5
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф.46
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов – Недвижимое имущество, по адресу: ***г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/22***

Наименование (назначение)	Общ. пл.	Инв. номер
Лаборатория (здание специализированное для производства строительных материалов)	377,9 кв. м	500/С-34114

Сведения о земельном участке: общ. пл. 16,4942 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования (доля 235/20000) для эксплуатации и обслуживания административного и производственных зданий и сооружений завода. Ограничения (обременения) прав: охранная зона водопровода, площадь 1,2273 га, 0,0800 га, 0,0696 га, 0,2046 га; охранная зона газопровода, площадь 0,5262 га, 0,0585 га, 0,0210 га

Начальная цена без учета НДС: 263 987,10 белорусского рубля (снижение 10 %)
Шаг аукциона: 13 199,36 белорусского рубля

Порядок ознакомления: Осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Буглак Екатерина Андреевна, контактный телефон +375 (29) 179-02-40.
Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на Р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 37853865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка».
Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов.
Условия оплаты предмета электронных торгов: Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но **не позднее тридцати дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.
Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить Организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение, а также возместить Продавцу затраты по публикации извещений в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов.
Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия.
Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 22.04.2019 г.
Дата, время и место проведения электронных торгов: 11.06.2019 в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by).
Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): 07.06.2019 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)
Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by

Извещение о проведении 11 июня 2019 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)	Здание «Административно-бытовых и вспомогательных помещений МАЗ по ул. Машиностроителей» общей площадью 12 555,8 кв. м (инвентарный номер в ЕГРНИ 500/U-63596, назначение: здание административно-хозяйственное); инженерные сети (общие затраты); теплотрасса; наружные сети ливневой канализации; наружные сети фекальной канализации, наружные сети водопровода; ограждение АБК АЗ; благоустройство; логотип ЗУБР; система ПТО ПТ 7637; монорельс ПТ 7735; монорельс ПТ 7648; кран подвесной мод. ПТ 6946-03.00.000 (5 шт.); шкаф ШРС 1-26
Местонахождение продаваемого имущества	г. Минск, пр-т Партизанский, 154А
Сведения о земельном участке	Площадь – 2,3887 га, кадастровый номер 500000000002009005, назначение – земельный участок для обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения
Продавец имущества	ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск
Организатор торгов	Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к.10
Начальная цена предмета торгов без учета НДС	7 353 535,28 бел. руб.
Сумма задатка	735 000,00 бел. руб.
Условия торгов	Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов
	Победитель торгов (покупатель) обязан согласовать дальнейшее функциональное назначение использования объекта недвижимости с Минским городским исполнительным комитетом с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 23.04.2003 №165 «Об утверждении генерального плана г. Минска и некоторых вопросах его реализации»

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Торги проводятся **11 июня 2019 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 22.05.2019 по 07.06.2019** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.
Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»)

Лоевский районный исполнительный комитет (Гомельская область) проводит открытый аукцион по продаже права заключения договора аренды земельного участка физическим, юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям.
Аукцион состоится 25.06.2019 г., в 14.30. по адресу: Гомельская обл., г.п. Лоев, ул. Ленина, 2 (в актовом зале здания райисполкома), при наличии не менее двух участников.
Возможность ознакомиться с земельным участком, реализуемым с аукциона, предоставляется продавцом в срок до 21.06.2019 года.
